Міхал Мінцэвіч ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Баляслаў Грабінскі ☞ I

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 32 (2674) Год LII | Беласток, 12 жніўня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Месяц беларускага чытання

Міхась Андрасюк з праграмай фестывалю

Брно, сталіца Паўднёвай Маравіі ў Чэшскай Рэспубліцы стала ў сёлетнім ліпені (па-чэшску — чэрвень!) сталіцай вольнай беларускай літаратуры. У Брне нарадзіліся найбольш вядомыя чэшскія аўтары Мілан Кундэра і Багуміл Грабал — мо гэта адно толькі і ведалі нашы аўтары. У Цэнтр эксперыментальнага тэатра на Капусным рынку, 9, у тэатр „Гуска на вяроўцы" запрошаны былі 30 беларускіх аўтараў, якія штодзень, дзве гадзіны перад выступам найлепшых чэшскіх аўтараў, чыталі свае творы. Сярод 26 прыехаўшых аўтараў розных пакаленняў з Рэспублікі Беларусь апынуліся таксама літаратары з Беласточчыны — Надзея Артымовіч, Міра Лукша, Міхась Андрасюк, Юрка Плютовіч ды са сталіцы Чэхіі даехаў пражываючы там Янка Максімюк. Сярод беларускіх пісьменнікаў — Уладзімер Арлоў, Алесь Разанаў, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Барыс Пятровіч Сачанка, Андрэй Хадановіч. Міжнародны Фестываль, ужо па сваёй чарзе восьмы, ладзіцца выдавецтвам і агенцтвам „Ветраныя млыны" пры падтрымцы міністра замежных спраў Чэхіі, міністра культуры, самаўрадаў горада Брна і Паўднёвамараўскага краю, Хартыі '77, матэрыяльнай — гандлёвай галерэі „Ванькаўка", медыйнай — Радыё Свабода, выдавецтва „Гост" і Чэшскага Радыё Брно. Штодзень усе выступленні трансляваліся па Інтэрнэце, а ў эфіры „Радыё Свабода" гучалі рэпартажы і размовы з фестывалю і яшчэ цэлы год можна будзе спампаваць з Інтэрнэту запісы выступаў тых аўтараў, якія не маюць магчымасці выступіць непасрэдна ў Беларусі. Творы і пераклады іх на чэшскую мову пастаўлены на вэб-сайце фестывалю ў чэшскамоўнай версіі (**www.autorskecteni.cz**). Як адзначыў дырэктар выдавецтва Пэтр Мінаржык, па выніках фестывалю плануюць яны выдаць кнігу. На сайце за ліпень пабывала больш за 10 тысяч наведвальнікаў. На жаль, не маглі даехаць у Чэхію такія выдатныя аўтары як Славамір Адамовіч, Святлана Алексіевіч, Вінцэсь Мудроў, Адам Глобус, Юры Станкевіч.

Пачынаючы Фестываль Уладзімер Арлоў прывёў словы Вацлава Гаўла, які сказаў, што немагчыма ўявіць новую Еўропу без Беларусі, а такія мерапрыемствы набліжаюць, на думку пісьменніка, Беларусь да Еўропы. Што цікава, усё мерапрыемства рыхтавалі маладыя аўтары і перакладчыкі з Беларусі і Чэхіі (Францішка Сакалова, Сяргей і Юлія Сматрычэнкі, Вольга Патапава, Каця Кедрон, Вераніка Бяльковіч, Макс Шчур, Крысціяна Шыянок, Аня Краснадземская, Радка Бэрноўска і іншыя багемісты), а заснавальнікамі і кіраўнікамі выдавецтва „Ветраныя млыны", якое вядзе шырокую дзейнасць па выдаванні чэшскай і замежнай літаратуры, а таксама распаўсюджванні драматургіі і ведаў пра тэатр, з'яўляюцца, як я іх назвала, „мараўскія браты" — маладыя Пэтр Мінаржык і Павел Ржэгоржык. Фестываль выклікаў немалое зацікаўленне сярод публікі — на цэлыя спякотныя вечары ў цэнтры 370-тысячнага Брна рэзервавалі час асобы відаць што зацікаўленыя культурай, зарыентаваныя ў палітычнай і культурнай сітуацыі нашага староння не толькі апошняга часу. Часта бачыліся тыя самыя твары, сярод якіх вылучаліся самаўраднік Роберт Кэпрт, дзеяч Незалежнай мараўскай партыі, спецыяліст па гісторыі мастацтва, які задаваў адно турбуючае яго пытанне пра адносіны і веды беларусаў пра мараўскі народ ды які кожнаму выступоўцу падрыхтаваў шмат матэрыялаў пра сваю радзіму. Таксама вельмі дапытлівы быў прафесар Ян Поспішыль, які не прапусціў ні адной сустрэчы. Чэшскім слухачам быў вядомы новы зборнік, шыкоўна, у палатнянай абложцы вокладкі выдадзены „Ветранымі млынамі" — „Анталогія беларускага апавядання", з якога творы друкаваліся таксама ў часопісе „Гост", пачынаючы ад класікаў такіх як Васіль Быкаў, канчаючы на наймалодшым пакаленні (на вокладцы віднее сімвал „Ву"; адзіным з-па-за Рэспублікі Беларусь аўтарам з'яўляецца ў гэтым зборніку Міра Лукша).

Ян Максімюк выступіў з эсэ пра даваенны лёс беларусаў Беласточчыны, лёс сваёй сям'і, разважаў пра шматмоўнасць (шматгаворкавасць) Беларусі. Сказаў ён: „За маёй памяці гэта першая такая прэзентацыя беларускай літаратуры за мяжою, дзе беластоцкае адгалінаванне беларускага прыгожага пісьменства трактуецца як неад'емная частка беларускай літаратуры. Арганізатар з беларускага боку Сяргей Сматрычэнка запрасіў вельмі моцную, выразную рэпрэзентацыю літаратараў Беласточчыны... Гэта мяне кранула". Міхась Андрасюк, з якім дыскусія цягнулася ў два разы даўжэй чым чытанне прозы, заўважыў: „Мы, беларускія аўтары з Польшчы, маем трошкі іншы літаратурны досвед, крыху іншую літаратурную адукацыю... Мне здаецца, што гэта козыр. Можам даць для беларускай літаратуры тое, чаго не можа даць аўтар, які нарадзіўся і выхаваўся ў Мінску... Неяк з перспектывы Брна мы бачым беларускія праблемы іначай, чым з перспектывы Беластока. Гэта для мяне новы ўрок". І Юрку Плютовіча, які выступіў з вершамі і эсэ па-польску, шмат распытвалі слухачы пра Беларусь: „Адчуваецца вялікая цікаўнасць чэхаў да ўсяго, што звязана з Беларуссю". Сапраўды, пабыўшы на фестывалі ў Брне, магу паўтарыць яшчэ раз: кожнае слова напісанае па-беларуску — вельмі важнае.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Мы і наш час ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Наш час — гэта час усёабдымнай глабалізацыі, камерцыялізацыі і урбанізацыі. Стыль жыцця „я ад'язджаю на вёску, каб стаць бліжэй да зямлі" ўдаецца рэалізаваць адзінкам. Бо няма ўжо і той ранейшай вёскі з яе традыцыйным укладам і няспешнасцю. Дваццаць першае стагоддзе пагражае знішчыць вёску дарэшты. Час збіраць камяні пакуль не прыйшоў...

Непапулярныя ісціны ☞ 2

Васіль САКОЎСКІ

Пачалі, напрыклад, паяўляцца ў нас аграгурыстычныя гаспадаркі і кватэры. Многія з іх абсталёўваюцца паводле нашых традыцыйных беларускіх узораў. З іконамі ў куце, з традыцыйным беларускім харчаваннем і народнымі назвамі страў, архаічнымі прыладамі апрацоўкі зямлі і лёну, з узорамі беларускай нацыянальнай вопраткі і г.д. Ну, проста беларускія нацыянальныя міні-музейчыкі. Імі цікавяцца прыезджыя турысты і такія кватэры карыстаюцца вялікім поспехам...

Свята ў беларускім засценку (2) ☞ 5

Ганна КАНДРАЦЮК

Калі мы ехалі праз вёску Лайкова, я падумала, што так выглядалі нашы вёскі ў час бежанства (1915-1921). Ацалелыя рэшткі драўляных будынкаў танулі ў моры крапівы і лапухоў. Праз дзіравыя стрэхі заўзята прадзіраліся бярозы і ліпы. Вуліца напамінала зялёны ход, сплецены са старых ліп. У вёсачцы асталіся дзве ўдавы, з якіх адна ходзіць з дапамогай кастылёў...

Каб не забылі свайго ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

Трэцяму летніку „Канікулы з традыцыяй", які з 23 па 27 ліпеня праходзіў у Музеі малой айчыны ў Студзіводах, рады былі вучні бельскіх школ і Мэлёры Дэбэвэ з Бельгіі. Дзеткі і моладзь, да якіх інструктары і арганізатары майстар-класаў звярталіся толькі па-свойму, пачыналі гаварыць на дыялектнай мове сёл, распаложаных вакол Бельска-Падляшскага...

Граф Аляксандр Прушынскі ☞ 9

Сяргей ЧЫГРЫН

Маладое пакаленне мала ведае пра графа Прушынскага. А вось людзі, каму за трыццаць і больш гадоў, памятаюць, як у 1994 годзе з Канады ў Беларусь прыехаў нейкі немалады ўжо граф Аляксандр Прушынскі, які афіцыйна заявіў, што ён прыехаў, каб стаць прэзідэнтам Беларусі. Тым больш што яго продкі былі з Беларусі родам, яны мелі сядзібу і палац у вёсцы Вялікая Рагозніца, што ў Мастоўскім раёне...

9 770546 196000

Мы і наш час

Калі ад Бога вечнасць, то ад д'ябла — час, — сцвярджаў вядомы сербскі пісьменнік Міларад Павіч. Сучасны чалавек, закручаны ў віхурным калейдаскопе дзён нібы трэска, зацягнутая вірам. Чалавек прыдумаў хуткія аўтамабілі, скорыя цягнікі і рэактыўныя самалёты, вынайшаў мабільныя тэлефоны і Інтэрнэт. Усё дзеля зручнасці і камфорту. Здавалася б, можна нікуды не спяшаць, весці памяркоўны лад жыцця і ўсё паспяваць. Але зусім наадварот, тэхнічны прагрэс стварае шалёны рытм існавання, сітуацыю пастаяннага цэйтноту, браку фізічнай сілы і змогі паспець усюды, дзе чалавеку нібыта трэба быць. Няма калі азірнуцца, схамянуцца, падумаць пра нешта большае, пра асноўнае і вечнае. Усё як у той прытчы, калі збегліся чэрці і давай маракаваць, як ім чалавека ад Бога адвадзіць. Адзін кажа, давайце пастаянна Бога і яго служкаў бэсціць, другі прапаноўвае славіць і ўзвялічваць бацьку ўсёй нячыстай сілы Шатана, а трэці — самы хітры — прыдумаў зрабіць так, каб у чалавека не было часу думаць. На тым і пастанавілі хвастатыя. Вось так і затлумілі чалавеку галаву.

Іншая рэч, якая цісне і зачмурае народ — гэта шматслоўнасць. Людзі, забыўшыся на біблейскага Эклезіяста („слова тваё хай ашчаднае будзе"), патанаюць у бессэнсоўных спрэчках і звадах. На вуліцах гарадоў тлум, мітусня і бясконцыя размовы пра падвышэнне коштаў і жарсці ў тэлевізійных серыялах. А з высокіх айчынных і міжнародных трыбун гучаць заклікі ў змаганні за мір і ўсеагульны дабрабыт. Як правіла, чым вышэйшы палітык, тым больш хлусні і фальшывых абяцанак. Мы жывём не ў век справы, а ў век рэкламы і піяру. Урэшце атрымліваецца, што не важна, як ты нешта зрабіў, выканаў ці не пастаўленыя дэкларацыі — важна толькі тое, як гэта падаў, у якую абгортку аформіў. Слова абясцэнілася ўшчэнт і не мае вартаснай цаны. Гэта ў старажытнасці мужчына, які не стрымаў свайго слова, падвяргаўся ўсеагульнай ганьбе і астракізму. Многія, запляміўшы асабісты ці грамадскі гонар, не знаходзілі іншага выйсця, як з'ехаць далёка ў іншую краіну ці нават застрэліцца. Цяперашнія ж палітыкі і дзеячы падаюць у адстаўку толькі ў крайніх выпадках, калі іх ужо прыціснулі да сцяны ганебныя факты. А ў беларускай прасторы час, пры ўсёй яго знешняй імклівасці, нібы застыў на месцы. Перастаўляюцца, перасоўваюцца некаторыя фігуры ва ўладных крэслах, адбываюцца нават сенсацыйныя адстаўкі, але сутнасць кіравання не мяняецца. У свядомасць люду надалей убіваюцца замшэлыя міфы і псеўданацыянальныя традыцыі.

Часам, аднак, можна пачуць і нешта новае. Вось на мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка, які трынаццаць гадоў зацята, з рэдкаснай упартасцю цягнуў Беларусь у расійскае ярмо, упершыню публічна заявіў пра тое, што Крэмль пагражае нашаму суверэнітэту (якое адкрыццё для беларускага народа!). А сапраўдны сябра, таварыш і брат у нашай маленькай, але ганаровай краіны застаўся толькі адзін — палымяны змагар з сусветным імперыялізмам, камандантэ Уга Чавес з Венесуэлы. Здарылася гэтая заява кіраўніка Беларусі пасля чарговага прыступу братэрскай любові з боку Масквы, якая зноў абвясціла Беларусі „газават". Пуцін то зацягвае пятлю, то адпускае яе — звыклая азіяцкая палітыка ў дачыненні да суседзяў. І не скажаш ужо — хто каго любіць, той таго чубіць. Супярэчнасці, перш за ўсё менавіта палітычныя, а не гаспадарчыя, зайшлі сапраўды глыбока. А ў беларускай гаспадаркі цяпер уся надзея на венесуэльскія крэдыты. Але ж, як той казаў, боты новыя, а пяты голыя...

Наш час — гэта час усёабдымнай глабалізацыі, камерцыялізацыі і урбанізацыі. Стыль жыцця „я ад'язджаю на вёску, каб стаць бліжэй да зямлі" ўдаецца рэалізаваць адзінкам. Бо няма ўжо і той ранейшай вёскі з яе традыцыйным укладам і няспешнасцю. Дваццаць першае стагоддзе пагражае знішчыць вёску дарэшты. Час збіраць камяні пакуль не прыйшоў...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Непапулярныя ісціны

Тэарэтычна, здаецца, усе згаджаюцца, што такія паняцці як „культура", „прагрэс" проста неабходныя для таго, каб чалавек аставаўся чалавекам, а грамадства грамадствам. Гэтыя паняцці — як усім вядома — не з'яўляюцца статычнымі, а ўвесь час мусяць развівацца, удасканальвацца. А вось на практыцы гэтыя шляхетныя паняцці прабіваюцца і прыжываюцца ў грамадстве вельмі цяжка, балюча, бо грамадства наша па сваёй натуры нейкае закарузлае, кансерватыўнае...

Менавіта з такімі ж цяжкасцямі і болем, ад самай вайны да сёння, прабіваюцца і прыжываюцца і нашыя нацыянальныя беларускія справы ў Польшчы.

Адным з першых было беларускае школьніцтва. У якіх жа болях нараджалася яно і колькі клопатаў ды маніпуляцый было звязаных з імі. То яго адкрывалі, то закрывалі, то зноў адкрывалі, то абмяжоўвалі. Прыхільнікаў жа яго абзывалі нацыяналістамі, якія вядуць раскольніцкую работу, якая шкодзіць і палякам, і беларусам ды іх сужыццю. Да таго ж беларуская мова мела перашкаджаць навучанню польскай мовы і гэтак далей, і таму падобнае...

І толькі дзякуючы нашым выдатным людзям, можна сказаць патрыётам, беларускае школьніцтва ў Польшчы паўстала і ўтрымоўваецца дасюль. Цяпер ужо ніхто разумны не скажа, што яно непатрэбнае, што рассейвае беларускі нацыяналізм і перашкаджае нашаму згоднаму сужыццю. А плюсаў нясе з сабою многа.

Маладыя людзі, дадаткова пазнаўшыя беларускую мову, літаратуру, гісторыю, унутрана напэўна багацейшыя за сваіх равеснікаў, пазнаўшых толькі польскую мову, літаратуру і гісторыю. Гэтыя дадатковыя веды будуць напэўна дапаможнымі ў іх жыцці, і напэўна не толькі не зашкодзяць ім і ўвогуле пальшчызне, а наадварот, узбагацяць яе і тым самым польскую культуру. Красамоўных прыкладаў таму ў беларускай і польскай гісторыі і сучасным часе мноства, трэба толькі хацець іх бачыць.

А колькім маладым людзям не толькі беларускай, але і польскай нацыянальнасці, закончыўшым нашы беларускія школы, далі яны дадатковыя шанцы выйсці ў людзі і яны пакарысталіся імі?! Пра нейкія шкоды, выкліканыя беларускім школьніцтвам, не чуў я, не ведаю...

З беларускім школьніцтвам непарыўна звязаны беларускі артыстычны рух. Раней яго ў нас зусім не было. А цяпер ён проста цвіце. Паўстала мноства нашых мастацкіх калектываў і надалей яны паўстаюць, арганізуюцца. Многія з іх проста дасканалыя і ніводная сучасная імпрэза не адбываецца без іх. Яны ажыццяўляюць і абнародваюць наш фальклор, нашы традыцыі, ствараюць новыя песні і сцэнічныя творы. Іх любяць як самі выканаўцы, так і публіка. Астаецца толькі радавацца, бо ёсць што паглядзець і паслухаць. А выступоўцамі і гледачамі з'яўляюцца ўсе нашы ўзроставыя групы. Круглы год адбываюцца нейкія агляды, спаборніцтвы, конкурсы, алімпіяды. Ахвотных выступаць і слухаць заўсёды хапае. Адным словам, ёсць у нас каму і што паказаць.

Аб'ектыўна кажучы, дык адны толькі выгады і карысці ад гэтага: карысць для нас, беларусаў, карысць для нашага рэгіёна і карысць для краіны...

Наступная справа — гэта беларускія радыё- і тэлеперадачы. Яны добра прыжыліся ў нашым грамадстве, добрую выконваюць работу і проста цяжка ўявіць жыццё без іх, царкоўныя ці свецкія яны. Беларускія перадачы інфармуюць, вучаць, выхоўваюць. Яны патрэбныя не толькі нам, беларусам, але і нашым суседзям-палякам, каб лепей пазнаць сябе і будаваць адну супольнасць. Калі ж не падабаюцца яны каму, не мусіць іх глядзець і слухаць.

А помніце, з якімі цяжкасцямі нараджаліся яны і колькі ў іх было праціўнікаў? Як цяжка было адваяваць кожную мінуту і вытаргаваць адпаведны час іх трансляцыі?..

Паявіліся і самаісныя станоўчыя змены ў гэтай сферы. Пачалі, напрыклад, паяўляцца ў нас агратурыстычныя гаспадаркі і кватэры. Многія з іх абсталёўваюцца паводле нашых традыцыйных беларускіх узораў. З іконамі ў куце, з традыцыйным беларускім харчаваннем і народнымі назвамі страў, архаічнымі прыладамі апрацоўкі зямлі і лёну, з узорамі беларускай нацыянальнай вопраткі і г.д. Ну, проста беларускія нацыянальныя міні-музейчыкі. Імі цікавяцца прыезджыя турысты і такія кватэры карыстаюцца вялікім поспехам...

А які фурор робяць у нас Купалле і стары Новы год! Яны праслаўляюць наш рэгіён. Значыць, апрача ўсяго іншага, наша тутэйшая беларушчына — гэта яшчэ і добры турыстычны прадукт, на якім усім рэгіёнам цяпер моцна залежыць...

(працяг будзе)

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Маючы надзею

Я ашарашаны своеасаблівымі спробамі прамоцыі Беластока, якія выплываюць адкульсці там з высокіх паверхаў магістрата гэтай метраполіі. Паколькі сёлета адзначаецца 150 гадавіна смерці доктара Людвіка Заменгафа, беластачаніна, стваральніка — як не забываюцца назваць мовазнаўцы — штучнай мовы эсперанта, выдумалі сабе тамака, што, можа, паявіліся б у Беластоку двухмоўныя эсперанцка-польскія назвы (незалежна ад гэтага факта, я не вельмі цямлю, як гэтая ідэя адносіцца да закону аб нацыянальных меншасцях і рэгіянальнай мове, у якім эсперанта не ўпамінаецца, а нават няма ў ім мовы сілезцаў).

Мала хто памятае, што жыўшы ў другой палове XIX і на пачатку XX стагоддзяў доктар Заменгаф выдумаў сабе новы спосаб зносін, бо не даваў сабе рады дагаварыцца з беластоцкімі расіянамі (беларусамі з іх новаатоесамліваючайся свядомасцю) ці немцамі. Можа, былі гэта проста яго паказушныя ўцёкі ад русіфікацыі, якой так баяліся ягоныя суседзі польскага паходжання. Ён сам такіх апасак не мусіў мець, але з гэтымі расіянамі, немцамі і іншымі гоямі трэба было жыць і мець нейкую надзею на тое, каб выжыць, таму, дарэчы, пад першым падручнікам гэтай мовы падпісаўся ён псеўданімам Doktoro Esperanto, значыць: „Доктар, які мае надзею". Так было падпісана першае выданне кнігі „Міжнародная мова". Уступнае слова і камплектны падручнік паказаліся першы раз з вялікімі цяжкасцямі ды па-руску. А кніга выйшла дзякуючы падтрымцы цесця Заменгафа. Мабыць, дзякуючы ўплывам гэтага выдаўцы хутка паявілася яна па-польску, па-французску, па-нямецку і па-англійску.

Я нязгодны з тым, што Заменгаф адно таму, што стварыў эсперанта, „вялікім чалавекам (беластачанінам) быў". На першым Кангрэсе эсперантыстаў у Францыі (1905 г.) сказаў ён: „Першы раз у гісторыі чалавецтва мы, прадстаўнікі розных народаў, стаім поруч сябе не як чужыя, канкурэнцыя, а як браты, якія не навязваюць іншым свае мовы, адзін аднаго разумеюць". Я кажу: Не! Якраз магчымасць узаемнага паразумення заключаецца на зразуменні адметнасці. Кожнага індывідуальна і ў грамадзе, якая адрозніваe гэтую супольнасць у найлепшым сэнсе па асобнасці, разнароднасці, між іншым шляхам адменнасці мовы (культурнай прыкметы народаў і грамадстваў). Роля уніфікаванай мовы з'яўляецца адным з найцямнейшых бакоў таталітарнага мышлення.

Яшчэ больш кур'ёзным аказаўся быць плебісцыт адной з мясцовых газет і Гарадской управы на пленэрную скульптуру, якую адкрылі б у будучым годзе на Днях Беластока, мабыць, недзе ў цэнтры горада. Сярод кандыдатаў на п'едэстал, апрача Людвіка Заменгафа, ёсць Сімона Косак (якая мала супольнага мае з Беластокам), памерлая заступніца расліннага і жывёльнага свету перш за ўсё Белавежскай пушчы. Яе постаць мела б быць аплецена вінаграднікам, пасадзілі б яе на шырокай гайданцы, на якой — тут цытата з плебісцытнай прапановы — яшчэ „сядзелі б, напрыклад, птушкі". Ёсць там яшчэ іншыя асобы, якіх дзейнасць адлюстравалася ў гісторыі горада. Але вось што мяне ўсхвалявала: мне здаецца, што тыя, што падкінулі ідэю ўшанавання заслужаных, не зрабілі гэтага ад сімпатыі, бо чаму ж мае Беласток асацыявацца з селядцом? І вось мы, беластачане, станем перад выбарам: пасярод горада мае быць або Сімона Косак, або селядзец. А, можа, пры стараннях за сарганізаванне ў Беластоку найбліжэйшага Кангрэса эсперантыстаў, падыходзіла б адмовіцца ад статуі селядца дзеля доктара Заменгафа? А, можа, і наадварот? А, можа, давайце зробім яшчэ цікавей: паставім помнік Доктару Эсперанта з селядцом у далоні, з Сімонай Косак, рассеўшыхся на арэлях, вядома, у атачэнні птушак?..

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Орля ў вачах „непрафесіянала”

Міхал Мінцэвіч услаўляе Орлю. Ён „артыст непрафесіянальны”, „журналіст непрафесіянальны” — гэтак пра яго пішуць у іншых газетах. А ён напісаў пра сваё старажытнае места, якому 500 гадоў, і пра яго жыхароў, нарабіў хранікёрскіх і мастацкіх здымкаў столькі, што магла б узнікнуць не адна кніга, не адзін альбом. Ён і радны, ды такі ўедлівы змагар за важныя і, для некаторых здавалася б, малаважныя справы, што на пасяджэннях Рады абмежавалі яго выступленні, запытанні ды інтэрпеляцыі да 10 хвілін. А чаму ён гэта ўсё робіць? „Каб ушанаваць людзей, усіх простых рупліўцаў звычайнае справы, для якіх прафесія была і ёсць пасіяй, па іх пакінуць памяць, як і пра месца, а таксама і па сабе”, — кажа Міхал Мінцэвіч, 1955 года нараджэння, арлянін, асоба вядомая сваімі пасіямі, шырокімі зацікаўленнямі не толькі ў сваёй аколіцы.

З чорна-белага здымка з сямідзесятых пазірае даўгавалосы маладзён, — тады музыкант. Як ён тады тарабаніў у бубны! У войску пад адзін пошчак яго барабана без іншай музыкі танцавалі да белага рання. Тэхнік-механік па будове машын узяўся і за маляванне, спачатку алоўкамі, а цяпер ягоныя копіі і карціны вядомыя ва ўсёй Польшчы. Ад адлюстроўвання рэчаіснасці на палатне ці паперы блізка да фатаграфіі. Вока фотаапарата — здавалася б, бязжарсна-аб’ектыўнае, усё ж паказвае тое, што бачыць той, хто здымае тую рэчаіснасць, ягоныя захапленні і жарсці, ягоныя адносіны да людзей, краявіду, красы і падзей. Галоўнае: запісаць чалавека, ягоную працу, сутыкненні з іншымі, духоўныя справы — ад нарадзін да магілы, царкву, крыжы... Стаў пісаць — супрацоўнічаў і з радыё, і з газетамі ды часопісамі. Калі стаў пісаць у „Ніву” — дык арляне заўважылі, што ўбачылі іх саміх: іх бытаванне цяпер, і памяць аб мінулым — ад успамінаў старажылаў пра праваслаўнае і яўрэйскае Орлі, пра юбілеі, школу, культурныя сустрэчы. Прывіваў сваю любоў да мінулага і вучням арлянскай школы, арганізуючы выставы і паказы. Зварухнуць трэба і грамадства, намовіць спонсараў, а перш за ўсё і ўлады гміны, каб сабрацца ды зрабіць выстаўку. Так як пару гадоў таму ў школе „Пяць стагоддзяў Орлі і яе ваколіц”, ці пра забытыя прафесіі і адышоўшых ужо людзей... Выдаць кнігі. Варта, каб такія культурныя падзеі падтрымала перш за ўсё гмінная ўлада. Не толькі фінансава, але і прысутнасцю-ўшанаваннем аўтараў і тых, пра каго гаворка на паказе. Бо кожны з тых, пра каго напісаў у „Ніве” ці „Czasopisie” аўтар, даклаўся сваім меншым ці большым стараннем да арлянскага дабрабыту, які не заўжды вымераеш грашыма. Варта перш за ўсё паказацца на такой выстаўцы...

Вось апошняя выстаўка Міхала Мінцэвіча, што ў гміннай бібліятэцы, „Забытыя прафесіі”, складзеная перш за ўсё з матэрыялаў друкаваных у „Czasopisie”, „Ніве”, „Над Бугом і Нарвою”, „Кантактах”, „Стражаку”, „Zza ławy radnego” (гэта невялікая частка з ужо сабранага Мінцэвічам) паказалася ў ліпені г.г. (будзе паказвацца да канца верасня). Са здымкаў, каляровых і чорна-белых ды ў сепіі спазіраюць працаўнікі-заўзятары: і земляробы-каняводы, і бондары, і сталяры, і ўспамінаюцца даўнія прафесіі ды людзі, якіх ужо няма, а ёсць яны ў спіску жыхароў — яўрэяў і праваслаўных ды іншых: півавары, капелюшнікі, цырульнікі, настаўнікі, рыбныя саладоўнікі, кацельнікі, не забыты і рабіны ды ксяндзы, ткачыхі, краўцы, ганчары, шкляры, мяснікі, пастухі, пажарнікі, брукары, кафляры, кавалі, пчаляры, халяўнікі, гарбары, калетнікі... Мусіў жа ж быць у такой мясцовасці і млынар, і пекар, і каваль. І музыкі былі. А былі і такія аматары, што гадавалі галубоў ці коней адно для свае прыемнасці. Зарэгіставаныя ў спіску 389 падаткаплацельшчыкаў з 1803 года...

Міхал Мінцэвіч: Калі стаў пісаць у „Ніву” — дык арляне заўважылі, што ўбачылі іх саміх

Выстава пачынаецца ад кароткай гісторыі Орлі і ад выставы паштовак, сярод якіх ёсць выдадзеная за ўласны кошт аўтарам з нагоды юбілею горада. Ёсць і ўспаміны найстарэйшых жыхароў Орлі, са здымкамі з арлянскага пажару з 1938 года. Пажар, ад зацярушанага агню ў яўрэйскай алейні, быў такі вялікі, што згарэла тады 540 дамоў, гарэў на палях гной ды лопала каменне бруку. І малыя, і вялікія падзеі краналі жыццё звычайных жыхароў старой і цяперашняй Орлі, сярод якіх ёсць такія, чыя памяць засталася адно ў кароткай памяці найбліжэйшых. Таму так заўзята Міхал Мінцэвіч стараецца, спісаць і захаваць хроніку звычайных падзей і людзей. Каб маладое пакаленне не забылася. Каб у школе былі матэрыялы і здымкі, каб можна было заўжды аднавіць тую памяць. Ды, на жаль, дагэтуль вучні і студэнты звяртаюцца да самога спадара Міхала: „Ты сабраў пра гэта і тое, пазыч мне матэрыял для працы”. А школа магла б захаваць усё тое, што даў ёй аўтар выставы, аддрукаваць, адбіць. Праўда, цяперашні дырэктар школы, хоць нетутэйшага паходжання, вельмі шмат і канкрэтна памагае і ў арганізацыі выставак, і вельмі зацікаўлены ў захаванні і развіцці шматкультурнасці ўсяе Орлі. Затое ёсць такія людзі, каму ў горле камяком тырчыць і тая шматкультурнасць, і пасія Міхала Мінцэвіча.

Выставу пра забытыя прафесіі, да якой, на жаль, не даклалася гміна, хоць мела гэта ў зацверджаных планах, не наведалі таксама і гмінныя валадары на яе адкрыцці. Праўда, кожны і пасля можа зайсці ў бібліятэку. І вось адна асоба каля поўдня, узяўшы кнігі, цікавілася зборамі, аглядала іх памаленьку, шукаючы на здымках і сваіх знаёмых. Ды яшчэ адзін чалавек пацікавіўся зборамі. Гэта быў 52-гадовы Адам С., будаўнік з Гайнаўкі, з якім, дарэчы, зусім нядаўна рабіў у газету інтэрв’ю сам Мінцэвіч. Ён накінуўся на стэнды, стаў рваць фотаздымкі, апраўленыя ў фольгу, павялічаныя тэксты, таптаць іх, некаторыя чавіў ужо на панадворку, затоптваючы ў гразь. Усё адбывалася ў прыступнасці ягонай сяброўкі, бібліятэкаркі. Так была знішчана палова выставы. Мінцэвіч зайшоў у бібліятэку са знаёмым каля 17 гадзіны. Вызваў паліцыю. Надкамісар Ян Сурэль, прэс-інфарматар бельскай паліцыі, сцвярджае, што, па словах бібліятэкаркі, яе знаёмы паявіўся ў бібліятэцы пад уплывам алкаголю, ды яго адносіны да выставы не маюць ніякіх падстаў ды прычын. „Гэта выключна чыстае хуліганства!” — заяўляе Ян Сурэль. Бібліятэкарка парваную выставу перанесла была ў другі пакой і хацела паправіць шкоды, ды візіт Міхала Мінцэвіча ёй перашкодзіў. На жаль, не змагла б яна гэтага зрабіць, бо частка пазычаных здымкаў не надаецца цяпер да аднаўлення, з чым мае вялікую праблему аўтар выставы. Яшчэ большы клопат мае Адам С., які абразліва аднёсся да паліцыянтаў, з якіх частка была ў цывільным. Паявіўся ён раптам у час прыезду паліцыі, паводзіў сябе нахабна. Паліцыянты скавалі яму рукі і павезлі ў камісарыят. У крыві меў ён больш за 3 прамілі алкаголю. Бібліятэкарка ў той момант злавалася, што выстава (а нават маленькая кветка ў вазоне, якую падарылі аўтару) перашкаджае наведвальнікам бібліятэкі пазычаць кнігі — хоць і яна раней, за войтам, выказала дазвол на ўстанаўленне пад сценамі стэндаў.

Міхал Мінцэвіч дагаварыўся, што паляк-хуліган верне яму 700 злотых, каб за іх можна было аднавіць знішчаную частку выставы. Добра, што знявечаныя дакументы і здымкі былі фільмаваныя (познаньскім тэлебачаннем і прыватнымі тэлекамерамі) — гэта дазволіць хоць крыху ўдакладніць страчанае.

„Nie życzę sobie, żeby moje nazwisko wisiało na płocie!” — пагневалася была гмінная бібліятэкарка за тое, што апынулася ў спіску асоб, якія дапамаглі Міхалу Мінцэвічу ў арганізацыі выставы. Гэта і спонсары, і ўсе тыя, хто разумее патрэбу падмацоўвання як кожны ўмее роднай культуры і мясціны. Што ж, у памяці і гісторыі ёсць і тыя, хто паліў святыні — таму гмінных герастратаў і іх прыхільнікаў упамінаць больш не будзем.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Калі школа пустуе

У Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) школу закрылі і дзеці вучацца ў Комплексе школ у Нараўцы. Школьны будынак у Ляўкове стаіць пусты. На адным коміне буслы зрабілі гняздо і прылятаюць сюды кожны год, выводзяць буслянят.

Зараз у будынку школы некаторыя вокны забіты дошкамі, а ў некаторых пастаўлены краты. З фасада школы звісае парваная громаадводная ўстаноўка, а ў дождж вада ліецца з даху па-за вадасцёкавай трубой і аблівае сцяну. У гэтым вінаватыя буслы ды іх раскіданыя „будаўнічыя" матэрыялы. І яшчэ адно. У дашку над ганкам, праз які вядзе галоўны праход у будынак, выбіта адна шыба.

З другога боку школы (ад рэчкі Нараўкі) адна вадасцёкавая труба разбураная і, па ўсім відаць, ужо даўжэйшы час вада заліває сцяну і сходы на спортпляцоўку. Тут жа над дзвярыма нехта вырваў аконную раму і яна ляжыць на сходах з разбітай ушчэнт шыбай.

З усходняга боку школы разбілі мур пад сходамі і аставілі вялікую прабоіну. Сходы гэтыя маюць разбітую бар'ерку і яны засмечаныя прутамі ды галінкамі з буслінага гнязда.

А перад школай была вялікая, двухстворкавая брама ды меншая ад яе брамачка. Зараз іх ужо няма, усё адкрыта. Недзе знік таксама адзін пралёт жалезнага плота.

Вось як бывае, калі школа пустуе. А гэта ж не так даўно быў адноўлены будынак.

(мох)

Выбары

У першай палове ліпеня ў вёску Азяблы прыехалі войт і сакратар Міхалоўскай гміны выбіраць солтыса. Жыхарам Азяблоў ніхто пра гэта не паведаміў, затое пра сход ведалі жыхары вёскі Ляўшы. Цяпер мае быць адзін солтыс на дзве вёскі, хаця Азяблы гэтага не хочуць. Выбары аднак адбыліся і першы вынік аказаўся нічыйны. У такой сітуацыі войт загадаў паўтарыць выбары і тады рэзультат аказаўся карысны для кандыдата Ляўшоў. Такім чынам солтыс будзе ў Ляўшах.

Жыхары Аязблоў маюць засцярогі да войта, паколькі паўтарыў ён выбары з тымі самымі кандыдатамі. На іх думку трэба было падабраць іншыя кандыдатуры, або адтэрмінаваць выбары.

У мінулым годзе ў час выбарчай кампаніі войт абяцаў, што ў вёсцы Азяблы будзе пракладзены асфальт. Цяпер ён кажа, што не даваў такіх абяцанняў, паколькі вясковая вуліца і дарога да вёскі не знаходзяцца ў яго распараджэнні, бо гэта павятовая дарога.

Не ведаю ці мая пісаніна ў „Ніву" ў нечым дапаможа, бо войт аддае перавагу газеце „Głos Michałowa", у якой ён часта выступае.

Дзядзька ЗАХАР

Культура ў Боцьках

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Размова з выконваючым абавязкі дырэктара Гміннага асяродка культуры ў Боцьках Кордыянам МІХАЛЬСКІМ.

— Якія галоўныя мерапрыемствы праводзіць у гадавым маштабе Ваш асяродак?

— У студзені ладзім Экуменічны вечар калядак, на якім з праваслаўным і каталіцкім рэпертуарам выступаюць калектывы з нашай гміны і запрошаныя госці, напрыклад сёлета былі гэта калектывы з Чаромхі і Бельска-Падляшскага, а летась — з Бельска і Орлі. З нашай гміны выступае па шэсць-сем калектываў, у тым ліку духавы аркестр, „Клекацякі", „Малыя Клекацякі", „Schola" ад каталіцкай парафіі, дарослыя і дзеці ад праваслаўнага прыхода ды група з Андрыянак. Мерапрыемства карыстаецца вялікім зацікаўленнем і з гэтай прычыны ад некалькіх гадоў адбываецца яно ў гімнастычнай зале мясцовага комплексу школ.

У канцы чэрвеня ладзім Святаянскую ноч. Сёлета была яна спалучана з канікульным сямейным пікнікам ды першай ваяводскай агратурыстычнай прэзентацыяй пад лозунгам „Гасцінныя парогі Падляшша". Апошняе мерапрыемства прыцягнула пад дваццаць агратурыстычных кватэр з Гайнаўскага, Бельскага і Сямятыцкага паветаў. Дзённыя мерапрыемствы адбываліся ў цэнтры Боцькаў, а начныя — над ракой Нурэц за школай.

У жніўні — разам з Гмінным асяродкам вырашання алкагольных праблем — ладзім Безалкагольную васемнаццатку. У Гмінны асяродак культуры запрашаем маладых людзей, якія ў даным годзе адзначаюць васемнаццацігоддзе, рыхтуем ім безалкагольны пачастунак з тортам са свечкамі, віктарыны, гульні, танцы.

У канікульны перыяд — ад трох гадоў — ладзім „Летнюю ноч пад зоркамі" — гастролі нашай бяседнай групы па вясковых святліцах. Сёлета такія мерапрыемствы адбыліся ўжо ў Андрыянках і Секлюках. У прынцыпе павінны яны адбывацца пад адкрытым небам, але згаданым імпрэзам перашкодзіла ў гэтым неспрыяльнае надвор'е і адбыліся яны ў святліцах. Вёскі наведвае таксама мабільнае кіно з фільмамі для дзяцей і дарослай публікі.

Штогод у жніўні ладзім разам з Беларускім грамадска-культурным таварыствам беларускі фэст. Такія імпрэзы адбываліся ў Красным Сяле, Андрыянках, Нурцы, Малочках; дзе адбудзецца сёлета — яшчэ канкрэтна не вырашана.

У кастрычніку, разам з Загсам, арганізуем „Залатое вяселле" тым парам, якія пражылі ў сужонстве па пяцьдзесят гадоў.

Апрача гэтага штогод адзначаем таксама Дзень жанчын, Дзень маці ды патрыятычныя святы 3 мая і 11 лістапада.

Да гэтага вядзем у нашым асяродку пастаянныя заняткі. На працягу школьнага года ў рамках праграмы „Святліца маім месцам" працуе ў нас Клуб маладога вынаходніка, які займаецца прыродазнаўчай адукацыяй, карыстаючыся такімі прыладамі як мікраскоп ці праектар. Займаюцца ў нас і „Малыя Клекацякі", якія вывучаюць падляшскія песні, рытміку, танцы; ім адводзім асаблівую ўвагу як маладой падмене старэйшым „Клекацякам". Старэйшая моладзь займаецца ў рамках праграмы „Czysta@gmina" прыроднай, інфарматычнай і экалагічнай адукацыяй, ладзячы экскурсіі і бівакі. Напрыклад, нядаўна наша моладзь наведала Белавежскі нацыянальны парк, разглядаючы яго як ідэальнае асяроддзе, а пасля наладзілі бівак у нас і прыглянуліся прыродзе, як яна выглядае ў нашай гміне. Чарговую экскурсію кіруем у Бобранскі нацыянальны парк, паглянем, якая вада ў Бобры, а пасля паглядзім, якая ў нашым Нурцы. У інфарматычным ракурсе займаемся выкананнем уласных сайтаў, мультымедыйнай прэзентацыяй і падрыхтоўкай друку буклета.

У перыяд канікул вядзем заняткі вакальнай школкі, а ў часе навучальнага года працуе ў нас філія бельскай музычнай школы з поўнай праграмай пачатковай музычнай адукацыі. Звыш дзесятка маладых людзей займаецца ў ёй. Зараз вучацца яны іграць на фартэпіяна, саксафоне, флейце; раней былі гітара і акардэон.

Пластычны гурток у гэтым годзе выканаў строі і сцэнічнае афармленне для нашай тэатральнай групы.

— З Вашых калектываў найбольш вядомыя „Клекацякі"...

— Калектыў са звыш трыццаці асоб складаюць капэла, танцавальная і вакальная групы. Найменш моладзі займаецца ў танцавальнай групе, бо гэта вучні і студэнты, але заўсёды некалькі пар танцуе. У капэле маем акардэон, кантрабас, трубку, бубен, кларнет.

Ад самога пачатку калектыў шчыльна супрацоўнічаў з нашымі пажарнікамі, удзельнічаў ва ўсіх ладжаных імі мерапрыемствах; вось у будучым годзе выбіраецца на агульнапольскія сустрэчы пажарнікаў.

„Клекацякі" асабліва многа канцэртуюць у летні час па ўсім ваяводстве, напр. былі ў Шэпятове на сельскагаспадарчым кірмашы, у Аўгуставе, на Свяце хлеба ў Цеханоўцы, у Чаромсе. Шмат гадоў ездзілі на Сяброўскую Бяседу, а вось сёлета, невядома як гэта сталася, атрымалі яны запрашэнне толькі тры дні перад імпрэзай; наш войт такое запрашэнне атрымаў на месяц раней.

„Клекацякі" канцэртавалі таксама ў замежжы, м.інш. у Беларусі, Грэцыі, Літве, Латвіі, Бельгіі, Швейцарыі; сёлета восенню таксама выбіраюцца ў Швейцарыю.

Наш духавы аркестр дае шмат канцэртаў у ваяводстве і ў краіне.

— А „Красуні"?

— Ужо два гады яны не спяваюць.

Была яшчэ ў Боцьках вакальная дзявочая група „Świeży Owoc", але дзяўчаты парасходзіліся.

— У якіх аб'ектах працуе Ваш асяродак?

— У нашым будынку ў Боцьках. Ёсць планы яго рамонту і разбудовы, але з гэтым трэба яшчэ пачакаць. У кастрычніку закончыцца рамонт будынка, дзе раней была Гмінная ўправа, і там будзе Культурна-турыстычны цэнтр. Туды поўнасцю пяройдзе бібліятэка разам з інтэрнэтавай кафэйкай, будзе там памяшканне для боцькаўскай святліцы, пункт турыстычнай інфармацыі разам з міні-музеем. Туды пяройдзе і музычная школа, а цяперашні будынак Гміннага асяродка культуры астанецца базай духавога аркестра і „Клекацякаў".

Не маем амфітэатра, але маем уласную мабільную сцэну, якую можам разгарнуць у любым месцы.

У нашай гміне працуе дзевяць вясковых святліц: у Старым Сяле, Красным Сяле, Выганове, Андрыянках, Секлюках, Бадаках, Альшэве, Дубне і Нурцы.

— Ці Ваш асяродак шэфствуе над гістарычнымі або прыроднымі памяткамі на тэрыторыі Боцькаўскай гміны?

— Не. Аховай, напрыклад, сакральных аб'ектаў займаюцца духоўныя ўлады і ваяводскі захавальнік даўніны. Варта, аднак, у гэтым плане заўважыць, што ў Боцьках маем дзве унікальныя памяткі даўніны. Гэта царква, якая хаця не надта даўняя, аднак мае арыгінальны кшталт з парай аднолькавых вежаў; яна дбайна дагледжана, пра што сведчыць прысвоенае міністрам культуры і нацыянальнай спадчыны званне „Zabytek zadbany". У касцёле, які занесены ў ранг помнікаў нулявога класа, знаходзіцца унікальны табернакль у галоўным алтары.

— З якімі арганізацыямі супрацоўнічае Ваш асяродак?

— Са Згуртаваннем прыяцеляў і сімпатыкаў Боцькаўскай зямлі супрацоўнічаем пры трасіроўцы турыстычных маршрутаў па тэрыторыі нашай гміны. Ужо вызначаны некалькі трас, апрацаваны іх турыстычна-гістарычныя апісанні, асталося толькі зрабіць іх разметку па мясцовасці.

Асяродак уключаецца ў даследаванне культурна-гістарычнай мясцовай спадчыны, напр. у нашай зале адбылася выстаўка археалагічных знаходак з Дубна.

У апошнім часе інтэнсіфікавана супрацоўніцтва са створанай у Гміннай управе ячэйкай па развіццю і прамоцыі гміны. Разам ладзім вонкавыя выставы і прэзентацыі нашай гміны. А цяпер у нас гасцюе выстаўка, наладжаная разам з Інстытутам нацыянальнай памяці.

— А з Беларускім грамадска-культурным таварыствам?

— Я на пасадзе ад паловы красавіка і яшчэ для гэтага не было нагоды, але ж набліжаецца штогадовы беларускі фэст, на які БГКТ заўсёды дапамагала запрашаць выканаўцаў. Маем шчыльны кантакт з „Арлянамі" і „Маланкай".

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Свята ў беларускім засценку (2)

(пачатак у 31 н-ры)

Калі мы ехалі праз вёску Лайкова, я падумала, што так выглядалі нашы вёскі ў час бежанства (1915-1921). Ацалелыя рэшткі драўляных будынкаў танулі ў моры крапівы і лапухоў. Праз дзіравыя стрэхі заўзята прадзіраліся бярозы і ліпы. Вуліца напамінала зялёны ход, сплецены са старых ліп. У вёсачцы асталіся дзве ўдавы, з якіх адна ходзіць з дапамогай кастылёў.

— Калісьці тут быў маёнтак, у якім выраблялі рукавіцы з авечай шкуры, — кажа пан Янэк.

Дарэмна шукаць тут паху авечай шкуры і слядоў слаўнай мануфактуры. Усе сляды мінуўшчыны даўно развеяліся вятрамі і зараслі дзікім пустазеллем. І зноў запанавала прырода. Паветра, перапоўненае салодкім водарам ліпавага цвету, дрыжэла-пульсавала ад гулу пчол і чмялёў.

— Каб неяк ліпавага цвету сарваць, — нясмела прапанавала Галя, у якой абудзіўся збіральніцкі інстынкт.

— Заўтра! — сказаў Валеры.

Перад Вашунавам мінулі мы возера з аброслымі берагамі. Яно, як і я, не пасавала да архетыпічнага вобліку „сінявокай Беларусі". Вада ў возеры была чорна-рыжая, як у маім прынарвянскім родным кутку. Колер вады, а яшчэ больш яе багонна-аерны пах, прызывалі знаёмыя карціны.

— З гэтых балот выцякае Бярэзіна, — сказаў Валеры. Апошняя звестка натхніла „вандраваць па вадзе" аж да Чорнага Мора, куды канчаткова ўплывае (разам з Дняпром) Бярэзіна.

* * *

На свята ў Засцянковую хатку толькі адны мы прыехалі на кані. Апошнія госці з'явіліся на нямецкіх або японскіх машынах. Перад хатай-музеем чакала нас па-святочнаму апранутая кампанія — сваякі і сябры гаспадара. Сам Юры Гіль, у саламяным капелюшы і вышыванай кашулі, выйшаў перад парог з чаркай мядухі.

— Калі хто першы раз у нашай Засцянковай хатцы, заўсёды вітаем яго чаркай! Такая традыцыя ў засценку.

Гаспадар выпіў са мной на прывітанне кілішачак салодкай гарэліцы. (Хоць Галя і Валеры тут ужо другі раз, іх таксама прывіталі сімвалічнай чаркай).

Мы ўвайшлі ў хату-музей:

— Вы ў мяне на ганаровым месцы, — Юры Гіль павёў мяне адразу ў трэцюю залу-пакой, дзе на сцяне красаваўся актуальны каляндар „Нівы". Каляндар вісіць насупраць абраза Святой сям'і, які ў цудоўны спосаб сам аднавіўся і тым самым запачаткаваў адраджэнне месца.

Пасля гаспадар завёў у пакойчык-спальню:

— А зараз выбірайце сабе месца для адпачынку!

Як тут выбіраць? Кожны выбар здаваўся найлепшым! Мне прапанавалі печ або „ксяндзоўскі" ложак?!

У рэшце рэшт я рашылася на ксяндзоўскі ложак.

У беларусаў-каталікоў „ксяндзоўскім" ложкам завуць найлепшае месца для спання. Факт, ксёндз лічыўся найлепшым з найлепшых гасцей у хаце.

Тым больш сям'я Юры Гіля моцна дружыла з ксяндзом Вінцэнтам Гадлеўскім і ксёндз-адраджэнец быў частым госцем у хаце дзядоў нашага гаспадара.

* * *

У Вашунаве сёння тры гадавіны: 15-годдзе Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віленскага краю, 65-годдзе ягонага старшыні Юры Гіля і 205 угодкі Ігната Дамейкі. Самы важны падарак падрыхтаваў сам юбіляр. Юры Гіль зачытаў грамадзе свой запавет, але пра справы спадчыны скажам далей, у зручны момант. Спачатку аддамо голас гаспадару, які гэтак апісвае родны засценак:

Хутар Вашунава — гэта не толькі мая бацькоўская хата, дзе прайшло дзяцінства. Гэта для мяне „Кут, ад маленства мне каханы... Тут недзе пуп мой закапаны".

Дзе б я не быў, у Сібіры ці ў Вільні, я заўсёды ў думках вяртаюся да цудоўнага куточка ў Беларусі, дзе я нарадзіўся: у невялічкую вёсачку, хутчэй — засценак Вашунава, што месціцца на Парфёнаўшчыне ў 20 км ад Буцлава.

Цяпер у маёй спадчыннай сялібе створаны гісторыка-этнаграфічны музей „Засцянковая хатка", які з'яўляецца структурным падраздзяленнем ТБМ Віленскага краю. Тут жа, у музеі, сабраная багатая бібліятэка „Крынічка", разлічаная перад усім на мясцовую дзятву. Перад хатаю капліца „Святая сям'я", пастаўлены крыжы. „Засцянковая хатка" — моцны асяродак беларушчыны ў Докшыцкім раёне. Сюды ідуць людзі, тут праводзяцца набажэнствы на роднай мове, адбываюцца фэсты з удзелам беларускіх, польскіх і літоўскіх мастацкіх калектываў. Тут пачуеш слова Божае, тут гучыць родная мова.*

І самае галоўнае — сюды прыязджаюць прыгожыя, шчырыя людзі. Як і сёння. Прыехалі пляменнікі з сем'ямі, дваюрадныя браты з жонкамі, швагры з радзінамі, сын Дзіма, братавая-ўдава... Ужо ў пачатку ўразіла ветлівасць кампаніі, іх натуральнасць у беларушчыне — у час малітвы ды ў прыватных бяседах за сталом усе размаўлялі пабеларуску. Нават пан Янэк, які лічыць сябе палякам і які час ад часу заводзіў уланска-патрыятычную песню *О муй розмарыне розвіяй се* (не змог развінуць яе па-за першую страфу), праз дваццаць чатыры гадзіны гаманіў на сакавітай беларушчыне.

— Уставайце дзеўкі! Надо карову даіць! — вітаў ён мяне і Галю разам з усходам сонца на наступны дзень...

* * *

У Вашунаве няма ўжо кароў. Засценак, як і згаданая ўжо вёска Лайкова — зарастаюць травой. І конь, на якім мы прыехалі з вакзала, быў „гарадскі". Дзядзька Ян жыве ў Параф'янаве, і толькі па-просьбе гаспадара Засцянковай хаткі запрог дзеля нас кабылку. Праўда, спачатку задума напалохала сям'ю. *Што тыя госці падумаюць пра нас?*

(працяг будзе)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Сям'я Юры Гіля; гаспадар у вышыванай кашулі

У наваколлі Вашунава нараджаецца рака Бярэзіна

*** Юрась Пятрусёў, *Засцянковая хатка*, Вільня 2006 (фрагмент аповеду *Мамелюкі або прыгоды Гіля ў Беларусі*)**

Гістарычна-літаратурны ўрок пры помніку

Гуманітарны ліцэй з Мінска — гэта „ліцэй у дарозе". Дзе ёсць нагода вучыцца, туды едуць вучні і настаўнікі, адным словам, едзе ўвесь ліцэй. Гэтым разам прыехалі ў Гданьск. А магчымае гэта было дзякуючы спонсарскай прыхільнасці ўлад горада Гданьска, якія разумеюць, што значыць салідарнасць з патрабуючымі, у гэтым выпадку з патрабуючай ведаў беларускай моладдзю. Вядома, што веды можна прысвойваць і ў Беларусі. Працуюць там ліцэі і школы рознага ўзроўню, але школ з беларускай мовай навучання і з незалежніцкай думкай пра сваю гісторыю і культуру няма. Прынамсі афіцыйна яны не існуюць.

З моладдзю і настаўнікамі Гуманітарнага ліцэя мы, беларусы згуртаваныя ў гданьскай „Хатцы", сустрэліся 27 ліпеня пры помніку Янку Купалу па вуліцы Янкі Купалы ў Гданьску-Аліве, дзе і адбыўся гістарычна-літаратурны ўрок. Гістарычны таму, што 27 ліпеня 1990 года была абвешчана „Дэкларацыя аб суверэнітэце Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі", аб чым усім прысутным прыпомніў прафесар Лявон Баршчэўскі. А літаратурны таму, што апрача напаміну пра біяграфію беларускага песняра, вучні дэкламавалі вершы і спявалі песні на словы Янкі Купалы.

Старшыня „Хаткі" Лена Глагоўская распавяла вучням і настаўнікам ліцэя аб тым, як разам з генеральнымі консуламі Беларусі хадайнічала перад гарадскімі ўстановамі Гданьска, каб па вуліцы Янкі Купалы паставіць помнік для ўшанавання памяці песняра. І хто б падумаў, што ў Гданьску, далёкім ад Беларусі і ўсходняй Беласточчыны, улады горада прыхільна паставяцца да гэтай ідэі і яна здзейсніцца ў выглядзе помніка.

Міхась КУПТЭЛЬ

Іржавая кладка, паламаныя лавачкі

Доўгая жалезабетонная кладка-віядук над чыгуначнымі пуцямі псуе выгляд вакзала ў Гайнаўцы. З жалезных бар'ерак абляцела фарба і яны іржавыя, брыдкія.

На першым пероне стаяць дзве лавачкі — паламаныя і брудныя.

Вось так чыгуначныя ўлады дбаюць пра вонкавы выгляд вакзала ў Гайнаўцы, дзе пасажырскі цягнік канчае свой маршрут і вяртаецца назад у Чаромху, Седльцы і Варшаву.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Вершы Віктара Шведа

Эсперанта

Сынок хоча быць франтам,
Бацьку пытае талкова:
— Што гэта эсперанта?
— Міжнародная мова.

— А якая краіна
Мову гэту займела?
— Няма краіны, сыну,
Такой на свеце цэлым.

Інтэлектуал

Пытае тату сынок Павел:
— Каго зваць інтэлектуалам?
Адказвае на гэта тата:
— Чалавек дзівакаваты.

А можа звар'яцелы крышку,
Бо надалей купляе кніжкі,
І іх чытае для капрызу,
Хоць мае ў хаце тэлевізар.

Максім і Ілья Фіёнікі са Студзіводаў

Таемны схоў

У цёмным куточку пад маміным ложкам спрытна схавалася пярэстая кошка. Максім з Ільюшам кошку шукаюць, разам пад ложкам Мурку гукаюць. Кранула кошка лапкай Ільюшку: — Хочаце, хлопчыкі, буду падушкай? Мякка і ўтульна разам пад ложкам... Паснулі разам брацікі з кошкай.

Міра ЛУКША

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК АДНА ДЗЯЎЧЫНА РАЗАМ СА СВАІМ ДЗЁННІКАМ СТРАЦІЛА І КАХАННЕ

О, гэтыя дзявочыя дзённічкі! Чаго толькі не пішуць там вашыя мілыя, прыгожыя ручкі! Неяк, зусім выпадкова, ваш дзядзечка зазірнуў туды — дык потым цэлы дзень хадзіў здзіўлены, задумённы і вельмі азадачаны... Але сёння мая гісторыя зусім не пра тое. А пра тое, як аднойчы такая ж міленькая, як і ўсе вы, мае харошыя дзяўчаткі, Улянка закахалася ну проста-такі да несканчальнай галавакружнасці ў гожага юнака Зміцера. А можа, і ў Рыгорку — нешта наконт ягонага імя дзяўчынка наша вечна блыталася... Затое як акуратна, часта і сціслым почыркам занатоўвала яна ўсе найдрабнейшыя падрабязнасці свайго і немагчыма-спапяляючага, і пранікнёна-сэрцаразрыўнога, і палымнеюча-шаленскага кахання ў тую самую таямніцу з таямніцаў — свой дзённік!.. Ад тытульнага ліста да самай апошняй старонкі быў урэшце спісаны ён.

І раптам, адной цудоўнай жнівеньскай раніцай, Улянка прачнулася і... — о жах і о плач беспрытульнай душы!.. — не знайшла свайго дзённіка. Можа, хто подла скраў яго з-пад аблітай без дай прычыны слязьмі гарачай падушкі. Можа, з'еў яго на сняданак, салодка мармычучы, кот Васіль. А можа, скурыў на горкі тытунь амерыканскі дзядзуля Улянкі, які гасцяваў той ноччу ў іх праездам, аднак замест водарнай мальбары паліў выключна свойскі самасад. Ці нават парвалі на шматкі ды пакруцілі ў іх пахнуткія кілбасы-пальчыкі ў суседскай краме, куды вечарам забягала яна за пэпсяй ды, магчыма, дзённік з гісторыяй свайго пякучага кахання і забыла.

Села дзяўчына перад расчыненым акном, расплюшчыла шырока вочы і... От вам і!.. Ні як усё пачыналася, ні колькі было спатканняў, а на іх — пацалункаў, ні зместу сваіх бясконца-любоўных „ад усяго сэрца!" цыдулак, ні нават імя ці то Зміцера, ці то, можа, Рыгоркі — нічога, анічога не магла болей успомніць Улянка. І тады яна горка, вільготна ды нясцешна заплакала.

Што заставалася рабіць у той момант вашаму дзядзечку Сіду? Толькі прайсці мімаходзь каля таго акна ды ўсміхнуцца ў светлыя дзявочыя вочкі: „Гісторыю кахання, мілая мая Улянка, не пішуць у дзённіках".

— А дзе і куды? — запытала яна, а за ёй, магчыма, запытаеце вы. Ну, а пра тое не мне вам ужо гаварыць!..

Ваш дзядзечка Сід
28 ліпеня 2007 г., Кобрын

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Пятро Давідзюк — Гайнаўка

Патрыцыя Міхалоўская — Кляшчэлі

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

Гардкор-2007 або
Муха ціп-топ на канікулах
— 5 —

Адразу, калі мы вярнуліся ў лагер, Генадзь Шакальскі пазваў Соню ў свой кабінет.

— Табе належыцца суровая кара, — заявіў мужчына, — каб ты запамятала на ўсё жыццё, што нельга маніць. Карацей, гэтую ноч заначуеш у лесе.

— Д...д...добра! — не сваім голасам адказала Соня. — А ў якім месцы я буду спаць?!

— На малой паляне, — буркнуў Шакальскі. — Я дам табе палатку, а спадар Ляскоўскі распаліць каля яе вогнішча, каб сюды не ішлі ўначы дзікія звяры.

— Разумею! — махнула галавай Соня.

Шакальскі ўстаў ад столка і накіраваўся да дзвярэй.

— Пачакай хвілінку, — сказаў ён, — мне трэба ў прыбіральню.

Калі „Шакал" закрыў за сабой дзверы, Соня адразу кінулася да шафы, дзе былі схаваныя мабільнікі. На шчасце яе тэлефон ляжаў на самым версе. Дзяўчына засунула яго ў кішэню і спакойна чакала аж вернецца загадчык. Шакальскі вярнуўся з мятлой у руках.

— Ведаеш, твая кара надта далікатная да правіны, — сказаў тонам, які не пераносіць супраціву, — а тут даўно ўжо ніхто не прыбіраў!

Парадкі ў лагеры занялі Соні аж тры гадзіны. У гэтым часе апошнія сябры летніка „Гардкор-2007" збіралі грыбы на вячэру. Генік Ляскоўскі прымусіў купацца ў балоце, а пасля ў надта халоднай рэчцы. На канец усім грыбнікам трэба было ўцякаць ад дзікіх сабак, якія нечакана накінуліся ў паваротнай дарозе...

Калі Соня даведалася пра лясныя прыгоды, яна нават уцешылася са сваёй кары.

— Але ты памрэш ад страху ў гэтым лесе! — хвалявалася Кася.

— Тады „Шакал" будзе мець мяне на сваім сумленні, — адказала Соня.

— А калі ў яго няма сумлення? — не адставала Кася.

— Дык што мне рабіць?! У мяне няма выбару!

— Ну няма, — Кася не ведала як суцешыць сяброўку. Сама баялася, што нехта пачуе іх размову і ёй назначаць кару.

Пасля нясмачнай вячэры Шакальскі з усмешкай на твары падышоў да Соні і загадаў:

— Нам пара збірацца!

— Ы-ы-ы... — паспела адно прамармытаць дзяўчына.

Разам на паляну пайшоў і Генік Ляскоўскі. Настаўнік фізкультуры распаліў невялікае вогнішча і моўчкі, як злодзей, уцёк назад у лагер.

На двары было цёмна хоць вока выкалі. Недзе ў гушчарах гукала сава. Ад спалоху Соня пачала плакаць. Яна думала, што не дажыве да рання. Дзяўчына дастала свой мабільнік і толькі цяпер пабачыла, што там ёсць эсэмэска. Ад Марціна, сына гаспадароў, у якіх сёння працавала збунтаваная моладзь. Хлапец пісаў, што калі Соня пайшла ўжо

з Шакальскім, яе сяброўкі прадыктавалі яе нумар тэлефона.

— І што мне яму напісаць? — думала заплаканая дзяўчына. Яна вырашыла, што напіша праўду. Пасля хвіліны тэкст эсэмэскі быў гатовы: „За тое, што я з табой гаварыла на панадворку, мне назначылі кару. Зараз я сама на малой паляне. Паміраю ад жаху!"

„А ці не памрэш да часу, калі я да цябе прыеду?" — адпісаў хлапец.

— „Пастараюся выжыць!"

Пасля дзесяці хвілін хлапец з'явіўся на паляне з гарачай гарбатай і смачнымі бутэрбродамі. Усю ноч Соня размаўляла з Марцінам. А калі раніцай Генадзь Шакальскі зайшоў за Соняй і пабачыў там Марціна, ён разышоўся быццам тайфун. Адразу стаў званіць бацькам хлопца:

— Чаму вы не пільнуеце свайго сына! Ці ведаеце, што ён зрабіў?!

Тэкст: natasza9922@wp.pl
Дызайн: lolcia05@tlen.pl

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Магда Васілюк — Супрасль

Ганна Мордань — Бельск-Падляшскі

Польска-беларуская крыжаванка № 32



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 28:

Аэрапорт, лях, кран, казка, грам, воз, крошка, век, кропка, крот, крок, парыў, свята, золак, род, рай, кабыла. Зорка, спор, звер, Ала, кок, край, лаз, крык, Ада, кроў, дых, крок, грот, кроп, мурашка, яры, рамка, атол, фан, града.

Каб не забылі свайго

Трэцяму летніку „Канікулы з традыцыяй”, які з 23 па 27 ліпеня праходзіў у Музеі малой айчыны ў Студзіводах, рады былі вучні бельскіх школ і Мэлёры Дэбэвэ з Бельгіі. Дзеткі і моладзь, да якіх інструктары і арганізатары майстар-класаў звярталіся толькі па-свойму, пачыналі гаварыць на дыялектнай мове сёл, распаложаных вакол Бельска-Падляшскага. Вучні ахвотна вучыліся тканню, вышыванню і выконвалі выцінанкі з паперы. Маладыя людзі хутка пераадолелі нясмеласць і вучыліся спяваць падляшскія песні, вадзілі карагоды ды знаёміліся з народнымі танцамі. Усе ўдзельнікі майстар-класаў паспрабавалі жаць жыта, а хлопцы дадаткова маглі прыглянуцца бляхарскаму рамяству.

— Маючы такую базу, якая ёсць у нашым музеі і ў мясцовых народных творцаў, грэхам было б не выкарыстаць усяго гэтага ў карысць моладзі — нашай будучыні, — заяўляе Дарафей Фіёнік, старшыня Аб’яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах”, якое з’яўляецца арганізатарам майстар-класаў. — У Бельску летам няма іншых майстар-класаў, якія праходзілі б у беларускай атмасферы. Ужо ад некалькіх месяцаў бацькі, свядомыя свайго выбару, дапытваліся пра наш летнік.

Пасля кароткай падрыхтоўкі вучні сталі самі вадзіць карагоды (на першым плане Аня Гуль, пасярэдзіне апякун Анна Фіёнік)

Вучняў, якія ў мінулым годзе займаліся ў студзіводскім скансэне, таксама не трэба было падгаварваць да ўдзелу ў летніку. Яны чакалі яго з нецярплівасцю, а некаторыя рашыліся нават тыдзень начаваць у хаце спадарства Фіёнікаў. Іншыя дзеткі найчасцей на веласіпедах прыязджалі на заняткі, якія вялі ў галоўным мясцовыя народныя творцы.

— У нас сямейная атмасфера і дзве Ані з Бельска са згоды сваіх бацькоў асталіся жыць у нашым доме ў час летніка. Ёсць у нас умовы для начлегу і трэба задумацца, ці не наладзіць у наступным годзе летніка, недзе на дванаццаць дзетак, з пастаянным жыхарствам, — кажа спадар Фіёнік.

Адвечная мара хлопцаў пра вышыўку і тканне ў час канікул хіба збылася

Заняткі ў Студзіводскім музеі распачаліся з вучобы тканню і вышыванню. Вучні дзерлі каляровыя тканіны на вузкія палоскі, каб выкарыстаць іх для ткання палавіка-„ходніка”. Марыя Сцепанюк са Студзіводаў з дапамогай старэйшых вучняў падрыхтавала аснову і тлумачыла моладзі, як трэба працаваць з кроснамі. У маладыя гады свайго жыцця выткала яна многа палатна, капаў, розных пакрывалаў і палавікоў. Разам з мужам рабіла ў Студзіводах валёнкі, а пасля ткала саламяныя вырабы, якія прадавала каператыву „Цэпэлія”.

— Я штогод на летніках вучу тканню. Раней паказвала я таксама як вырабляюцца валёнкі, — гаворыць Марыя Сцепанюк. — Гэтыя кросны зрабіў мой муж і я на іх вельмі многа ткала. Пасля Дарафей Фіёнік папрасіў і я аддала іх у музей. Маладыя ахвотныя вучобе, але малодшым вучням цяжкавата справіцца з тканнем, а старэйшыя ўцягваюцца і працуюць.

— Кросны і іншыя нашы прылады не стаяць мёртвымі, толькі працуюць у час летніка і гэта нас цешыць. Рыхтуючыся да летняга мерапрыемства і ў час яго мы таксама дасканалім свой варштат працы, — кажа Дарафей Фіёнік.

Вышываць вучыла Марыя Красоўская з Бельска-Падляшскага, якая прывезла з сабой загадзя падрыхтаваныя ўзоры. Вучні спачатку перарысоўвалі іх на свае лісты паперы, а пасля, карыстаючыся каляровымі ніткамі, на канве вышывалі крыжыкам палоскі з даўнімі арнаментамі і кветкі. Здаралася, што для хлопцаў лепш атрымлівалася вышыванне, чым для дзяўчат. Аднак наогул апошнія праяўлялі большае зацікаўленне вышыўкай і аказвалі большую цярплівасць, якая неабходная ў час працы з іголкай.

— Такія майстар-класы па вышыўцы вельмі патрэбныя. Прынесла я нашыя даўнія беларускія ўзоры і добра было б, каб яны не прапалі. Няхай вучні перададуць іх сваім дзеткам і пасля наступным пакаленням, — тлумачыць Марыя Красоўская. — Паводле такіх арнаментаў у мінулым вышывалі блузкі і кашулі.

— Нам вельмі падабаецца вышыванне кветак і беларускіх узораў, — кажуць Анна Гуль і Мартына Яканчук, якія на студзіводскім летніку займаюцца ўжо другі раз. Аліцыя Перавой таксама палюбіла вышыўку. Яна ўпершыню на летніх занятках, а заахвоціла яе сястра з „Жэмэрвы”.

Антаніна Сцепанюк са Студзіводаў вучыла выконваць кломлю, якую ў Студзіводах часта выкарыстоўвалі ў якасці сурвэты на стол. З дапамогай старэйшых дзяўчат выканала яна аснову, на якой вучні сталі рабіць вышыўку.

— Заўсёды аснова была з ільняных нітак, каб была яна моцнай і не рвалася, а для вышывання ўзораў выкарыстоўваліся каляровыя ніткі. Такую кломлю-сурвэту падарыла я Дарафею Фіёніку, а ён папрасіў мяне паказаць дзеткам як яе зрабіць, — гаворыць Антаніна Сцепанюк.

— Добра ведаць, як калісь працавалі і навучыцца традыцыйным заняткам, — гавораць дзяўчаты, якія з вялікім ангажаваннем працавалі на летніку.

Кіраўнік калектыву „Жэмэрва” Анна Фіёнік, ужо традыцыйна, вучыла ў час летніка дзетак і моладзь народным спевам і танцам. Перад кожнымі заняткамі вялася праца з голасам і паўтараліся пераклічкі.

Марыя Сцепанюк цярпліва вучыла дзетак ткаць на кроснах

— Нам вельмі падабаюцца гульні, якія арганізуе Анна Фіёнік. Любім спяваць і вадзіць карагоды, — заяўляюць Аня Гуль і Мартына Яканчук.

— Найважнейшае, што дзеткі знаёмяцца са сваёй беларускай культурай і традыцыямі. Нашы продкі апрача матэрыяльных здабыткаў накапілі таксама багатую духовую спадчыну, песні і танцы, з якімі маем нагоду пазнаёміцца. Вучні даведваюцца, якой цяжкай была работа ў мінулым і вучацца цярплівасці. У час працы і гульняў дзеткі могуць пазбыцца накопленых у час школьнага года дрэнных эмоцый, — кажа Анна Фіёнік. — Дзеткі ў час нашых заняткаў сутыкаюцца з нашай жывой мовай. Мы гаворым да вучняў выключна па-свойму і бачым, што некаторыя дзеткі ўмеюць гаварыць на дыялектнай мове. Нават Мэлёры з Бельгіі ўсё разумее, калі гаварыць да яе па-свойму.

— Я таксама крыху ўмею гаварыць па-свойму. Летам прыязджаю да сямейнікаў у Праневічы і там адпачываю. Аднак у Бельгіі з бацькам і сябрамі я гавару толькі па-французску, — заяўляе Мэлёры Дэбэвэ, якая добра гаворыць таксама на польскай мове.

Іншыя дзеткі таксама расказвалі пра веданне роднай мовы.

— Я вучылася гаварыць па-свойму ў бабулі ў Кошках. Вучоба беларускай мове на занятках у „тройцы” яшчэ больш разбудзіла ўва мне зацікаўленне родным. Калі трэба сказаць больш складаныя словы, вымаўляю іх яшчэ па-польску, — тлумачыць Аня Гуль.

Маладым людзям спадабаліся жніўныя песні, агулькі і народныя творы, якія выконваліся на розных урачыстасцях. Удала гулялі яны ў час вучобы танцам і вадзілі карагоды. Вучоба спалучаная з гульнямі давала станоўчыя рэзультаты і заахвочвала моладзь да яшчэ большай актыўнасці. Цікавай гульнёй дзеткі палічылі таксама выконванне папяровых выцінанак, але пры гэтым занятку патрэбная была цярплівасць. Анатоль Краўчук вучыў выконваць папяровыя фіранкі, якія ў мінулым упрыгожвалі вокны.

— Дзеткі ў час майстар-класаў інтэгруюцца і маюць магчымасць спалучыць вучобу з гульнямі. Вучні раскрываюцца на іншых і вучацца існаваць у групе. У час першых сустрэч хлопцы баяцца дзяўчат як агню, а пасля водзяць ужо карагоды, трымаючы дзяўчынак за рукі. Для моладзі важны таксама рэзультат іх працы ў выглядзе вышытага палатна ці выцінанак з паперы, якія забіраюць дамоў, — тлумачыць кіраўнік летніка Дарафей Фіёнік. — У музеі застаюцца вынікі іх калектыўнага ткання ў выглядзе „ходнікаў”, на якія змогуць паглядзець нават праз нейкі час, калі наведаюць наш скансэн.

З бляхарскім рамяством знаёміў хлопцаў Ян Фіёнік, а ўсе вучні разам з апекунамі хадзілі жаць сярпамі жыта, хаця хутчэй за ўсё былі гэта зажынкі. Майстар-класы праводзіліся ў рамках большага праекта, рэалізаванага з удзелам музейнага калектыву „Жэмэрва” і фінансаванага Фондам „Pro Bono Poloniae”. Сам летнік фінансавала перад усім Гарадская ўправа Бельска-Падляшскага.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

— Я аптыміст. Я думаю, што ў нас будзе добрая краіна, якой не было ніколі. Хаця ўсім нам будзе нялёгка. Але галоўнае, хто ў нас стане прэзідэнтам пасля Лукашэнкі. Шчыра кажу, мне верыцца, што пра нас некалі будуць казаць, як кажуць сёння пра Сінгапур...

У гасцях у графа Аляксандра Прушынскага

Маладое пакаленне мала ведае пра графа Прушынскага. А вось людзі, каму за трыццаць і больш гадоў, памятаюць, як у 1994 годзе з Канады ў Беларусь прыехаў нейкі немалады ўжо граф Аляксандр Прушынскі, які афіцыйна заявіў, што ён прыехаў, каб стаць прэзідэнтам Беларусі. Тым больш што яго продкі былі з Беларусі родам, яны мелі сядзібу і палац у вёсцы Вялікая Рагозніца, што ў Мастоўскім раёне. Але графа Прушынскага не зарэгістравалі кандыдатам, бо трэба было пражыць у Беларусі не менш чым 10 гадоў. Аднак граф не адчайваўся. Ён тут жаніўся, у яго нарадзілася двое дзяцей, і ён шчасліва жыве з маладой жонкаю ў Мінску. Кожнае лета граф Прушынскі прыязджае з сям'ёй у вёску Вялікая Рагозніца, побач з сядзібай і палацам яго бацькоў і дзядоў, і тут жыве. Праўда, цяпер у палацы знаходзіцца кантора мясцовага сельскага вытворчага кааператыва імя Адама Міцкевіча. За палацам — парк, ёсць некалькі пабудоў. Але ўсё гэта мае даволі непрыстойны выгляд. Акрамя самога палаца. Аляксандр Прушынскі некалькі разоў прасіў даць яму адну з гэтых пабудоў, маўляў, ён яе за свой кошт давядзе да ладу. „Не даюць. Усё прападае, але і мне не даюць", — здзіўляецца сын і ўнук былых гаспадароў гэтых уладанняў.

На мінулым тыдні наш карэспандэнт пабываў у гасцях у графа Прушынскага ў вёсцы Вялікая Рагозніца, дзе ён паказаў сядзібу сваіх продкаў. Пакуль з графам мы хадзілі па зямлі, на якой некалі жылі Прушынскія, да нас падышлі ўчастковы міліцыянер і намеснік старшыні гаспадаркі з пытаннямі хто мы такія, хто нам дазволіў фатаграфаваць наваколле, якая мэта нашага візіту і г.д. Але сустрэча з імі прайшла без асаблівых канфліктаў. Праўда, намеснік старшыні гаспадаркі выказаў журналістам сваё незадавальненне. Маўляў, некалькі гадоў таму прыехалі журналісты з Ваўкавыска і напісалі пра ўборку кукурузы, але пры гэтым занізілі лічбу: мы сабралі большы ўраджай кукурузы, а яны напісалі значна менш. Шаноўныя вяскоўцы! Мы пра вашу кукурузу, каб вы і хацелі, пісаць не будзем. Няхай у вас ураджаі яе будуць самыя вялікія ў Еўропе. Абы гэта было на карысць вашай гаспадаркі і тым, хто там жыве. А граф Прушынскі дадаў, што прыйдзе час і мы ў Беларусі адродзім усе храмы, сядзібы і палацы, якія існавалі падчас Вялікага княства Літоўскага і якія разбурылі войны, акупанты і бальшавікі. А яшчэ Аляксандр Прушынскі даў інтэрв'ю нашаму карэспандэнту.

Граф Аляксандр Прушынскі каля маёнтка сваіх продкаў у вёсцы Вялікая Рагозніца Мастоўскага раёна

— Граф Прушынскі, скажыце некалькі слоў пра сябе.

— Мне цяпер 74 гады. Я маю грамадзянства канадскае і польскае. Ёсць метрыкі, што я быў хрышчаны ў Рагозніцы. Ужо 15 гадоў жыву ў Беларусі. Адсюль паходзяць мае продкі, тут яны мелі ў вёсцы Вялікая Рагозніца Мастоўскага раёна свой маёнтак і зямлю. Сюды я штогод летам прыязджаю з новай сям'ёй (першая жонка мая памерла) і тут жыву.

— І як Вам жывецца ў Беларусі?

— Добра. Мая канадская пенсія ў 5 разоў большая за сярэдні беларускі заробак. Таму я вольны чалавек на зямлі сваіх продкаў, куды хачу — езджу, дзе хачу — жыву.

— Граф Прушынскі, давайце ўспомнім 1994 год, калі Вы хацелі балатавацца на пост прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

— Аб гэтым я заявіў у снежні 1992 года. Тады яшчэ ніхто не ведаў: будзе ў Беларусі прэзідэнт ці не. Ці гэта будзе наогул парламенцкая рэспубліка. Пасля ўжо беларускі парламент прыняў закон, што вылучаць сябе на пасаду прэзідэнта павінен грамадзянін, які пражыў у Беларусі не менш за 10 гадоў. Гэты закон, я лічу, быў прыняты супраць мяне. Так мне не ўдалося зарэгістравацца кандыдатам у прэзідэнты. І тады мне прыйшлося на ўсю Беларусь заявіць, што я пераможца на выбарах. Бо ўсе пабаяліся і прагаласавалі за такі закон, які не дазволіў мне балатавацца. Супраць мяне галасавалі і камуністы, і прадстаўнікі БНФ у парламенце, і ўсе астатнія. Але мне здаецца, што я тады ўсё ж не быў да гэтага падрыхтаваны. Хаця я ведаў і ведаю, як нашу краіну сёння вывесці з нялёгкага эканамічнага крызісу. Давайце ўспомнім Тайвань, Сінгапур, Паўднёвую Карэю, дзе была амаль палітычная дыктатура, але была свабода эканамічная. І сёння гэтыя краіны — самыя квітнеючыя ў свеце. У чым памылка сёння Аляксандра Лукашэнкі? У тым, што ў Беларусі няма эканамічнай свабоды.

— Ды не толькі эканамічнай свабоды...

— Сапраўды. Калі вы будзеце сустракацца з сённяшнімі палітыкамі, то спытайце ў іх: ці ёсць у вас праграма развіцця краіны на заўтра? А раптам заўтра Аляксандр Лукашэнка па ўласным жаданні адмовіцца ад пасады прэзідэнта. Што тады? Па якой праграме мы будзем будаваць свой дабрабыт? А я напісаў і выдаў на польскай мове дзве кніжкі па гэтым пытанні, лічыце, што гэта мая праграма на заўтра. Я шмат чаго ведаю, я жыў у шасці, а пабываў у 30 краінах. Вопыт маю. Бывае ў Кітаі і Аляксандр Рыгоравіч. Але ж чаму ён не спытае пра эканамічную свабоду. Кітай запрасіў на пасаду саветніка кіраўніка сваёй дзяржавы былога прэм'ера Сінгапура. Ён падняў на ногі ўвесь вялікі Кітай. Бо тое, што ён кітайцам раіў, яны поўнасцю слухалі. І вынікі ў эканоміцы гэтай краіны — выдатныя. Чаму б Лукашэнку падобнае не зрабіць...

— І сапраўды, чаму?

— А таму, што Лукашэнка закалыханы Савецкім Саюзам. І калі б быў той Савецкі Саюз добрым, то мы жылі б у ім да сённяшніх дзён. Але там, відаць, было не ўсё добра і ладна.

— Калі б сёння Вы сустрэліся з Аляксандрам Лукашэнкам, што яму хацелі б сказаць?

— Тое, што цяпер сказаў вам. Скажыце, калі ласка, колькі трэба часу, каб у Беларусі адкрыць сваю ўласную фірму?

— Многа часу, здаецца, не менш за месяц.

— А ў Канадзе — пару хвілінаў. Прыйшоў у кантору, запоўніў бланк А-4, заплаціў 60 долараў — і ў цябе ёсць фірма.

— Дык што чакае Беларусь заўтра?

— Я аптыміст. Я думаю, што ў нас будзе добрая краіна, якой не было ніколі. Хаця ўсім нам будзе нялёгка. Але галоўнае, хто ў нас стане прэзідэнтам пасля Лукашэнкі. Шчыра кажу, мне верыцца, што пра нас некалі будуць казаць, як кажуць сёння пра Сінгапур. Я гавару Мілінкевічу: хопіць вам ездзіць на Захад, паедзьце ў Маскву і раскажыце, што мы не хочам ніякіх саюзаў. Мы павінны быць самастойнай дзяржавай. Але ў нас сёння вялікія праблемы ў эканоміцы краіны. Калі дзейнічае нейкая беларуская фірма, якая прадае ці купляе цукар у замежнай фірме, то нельга каб туды ўлазіла дзяржава і забараняла гэта рабіць. Нам нельга мець сёння 10 заводаў, на якіх працуе 10 тысяч чалавек. А лепш мець 10 тысяч прадпрыемстваў, дзе працавалі б па 20-50 чалавек. Бо адзін банкрут на буйным заводзе ці фабрыцы робіць беспрацоўнымі тысячы людзей. Так не павінна быць. Паглядзіце на нашы беларускія веласіпеды — гэта ж барахло. Але яны яшчэ даражэйшыя за тыя веласіпеды, якія прадаюцца ў Польшчы, хаця польскія лепшыя за нашыя. Мы з Беларусі возім у Польшчу толькі салярку, цыгарэты і гарэлку. Больш нічога. Але адтуль прывозім усё: і прадукты, і будаўнічыя матэрыялы, і электратавары. Яны лепшай якасці і таннейшыя, хаця заробак там большы, чым у нас. Як гэта так?.. Праўда, у Мінску пякуць вельмі добры хлеб, які з вялікім задавальненнем куплялі б і ў Польшчы. Але ж ніхто яго там не прадае. А каб хлеб „Радзівілаўскі", „Траецкі", „Нарачанскі", „Юбілейны" пякла прыватная фірма, то рэалізацыя яго была б наладжана паўсюль. Літоўскі хлеб горшы за наш, але яго літоўцы прадаюць у Польшчы.

— З кім з палітыкаў Вы сёння сябруеце?

— Больш-менш кантактую з Аляксандрам Мілінкевічам.

— Чым Вы цяпер займаецеся?

— Падрыхтаваў перавыданне сваёй новай кнігі „Беларусь: учора, сёння, заўтра" на польскай мове. Часта выступаю з дакладамі на канферэнцыях і сустрэчах.

Тэкст і фота Сяргея ЧЫГРЫНА

http://t-styl.info

Гродна — адзін са старажытных гарадоў Беларусі — сёння перажывае далёка не лепшыя часы свайго існавання. Мясцовыя ўлады, зусім не натхнёныя ягонай гісторыяй і культурай, „рэканструююць" гістарычны цэнтр, знішчаючы многія архітэктурныя помнікі. Грамадскасць зрабіць з гэтым амаль нічога не можа, бо яна, як і мае быць у недэмакратычнай краіне, не адыгрывае сур'ёзнага значэння ў кантролі над дзейнасцю мясцовых граданачальнікаў.

Разам з тым, гродзенскія муры нічога не ўяўляюць з сябе без тых гродзенцаў, якія маюць у сваёй аўры дух старога горада, які нельга „рэканструяваць" і тым самым знішчыць. Аднымі з такіх можна без перабольшання назваць стваральнікаў он-лайн газеты і он-лайн радыё „Твой стыль". Каб пазнаёміцца з імі бліжэй, варта зазірнуць у Інтэрнэце на адрас **http://t-styl.info**.

Першае ўражанне ад сайта не зусім яскравае. Бачна, што гаворка ідзе пра гродзенскія навіны і падзеі. Уверсе выяўлення змяняюцца твары маладых людзей, якія, аказваюцца складаюць рэдакцыю „Твайго стылю". Пазнаёміцца з мэтамі і камандай партала атрымаецца толькі тады, калі прашпацыруеш па рубрыках, выйсці да якіх месцяцца зверху і носяць не зусім звыклыя для большасці падобных інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў назвы.

Зразумела, першая старонка аддадзена навінам. Прыемна бачыць, што абнаўляюцца яны даволі часта, а гэта значыць, што рэдакцыя не дазваляе сабе нядбайнага стаўлення да галоўнай сваёй функцыі — інфармавання аб апошніх найбольш важных падзеях гэтай мясцовасці. Праўда, ёсць невялікая рэдактарская хіба — з назвай свайго роднага горада трэба ўсё ж такі вызначыцца хаця б у рамках уласнага партала, бо не зусім зразумела, як мы, нягродзенцы, мусім казаць — Горадня ці Гародня. На сайце ж сустракаюцца абодва варыянты.

Бліжэй пазнаёміцца з рэдакцыяй мы зможам на старонцы „Хто тут?", таксама як і з мэтай яе дзейнасці. Аказваецца, „Твой стыль" гэта моладзевы інтэрнэт-праект, які робіцца намаганнямі маладых журналістаў, большасць з якіх толькі пачынае займацца данай працай. «Аўтары „Твайго стылю" — юнакі і дзяўчаты, якія толькі пачынаюць свой шлях у журналістыцы, здольныя, творчыя людзі, неабыякавыя да таго, што дзеецца навокал, — прэзентуюць сябе „твойстылеўцы". — Каб далучыцца да „Твайго стылю", дастаткова скантактавацца з намі. Ужо зараз ты можаш каментаваць тэксты, змешчаныя ў нашай газеце. Запрашаем цябе таксама стаць нашым карэспандэнтам! Дзеля гэтага трэба мець ахвоту паспрабаваць сябе ў журналістыцы, мець ідэі матэрыялаў (навіны, інтэрв'ю, рэпартажы, артыкулы, фотаздымкі і г.п.) ды скантактавацца з намі. Разам з намі ты авалодаеш асновамі журналістыкі з дапамогай лепшых гарадзенскіх і не толькі майстроў слова (бясплатна!), набудзеш магчымасць творчай працы ў маладой і вясёлай кампаніі!»

Праслухаць он-лайн радыё можна, зайшоўшы на старонку „Слухай!". Пакуль, як відаць з размешчаных гіперспасылак, у эфір яно выходзіла пяць разоў.

Навіны культурнага жыцця Гродна змешчаны ў рубрыцы „Культурыстыка". Аб спорце распавядае „proСпорт", а пра тое, куды варта было б паехаць, каб адпачыць ці паваланцёрску папрацаваць, абвяшчаецца на старонцы „Ёсць справа!".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

З марай пра Лігу чэмпіёнаў

Пасля шэрагу няўдалых гадоў беларускіх футбольных клубаў у еўрапейскіх кубках можна сказаць, што сёлетні паход адзначаны пячаткай шанцавання і поспеху. Найбольш станоўчых эмоцый айчынным заўзятарам прынёс пакуль чэмпіён краіны БАТЭ. Пасля таго як барысаўцы гераічна пераадолелі бар'ер у выглядзе кіпрскага „Апаэля" (заўважым, што гэта была першая вікторыя беларускіх клубаў над кіпрскімі ў еўракубках), на іх шляху ў другім кваліфікацыйным раундзе Лігі чэмпіёнаў стаў чэмпіён вострава Ісландыя. Каманда з цяжкавымоўнай назвай аднайменнага горада „Хабнарф'ёрдзюр" пры бліжэйшым разглядзе аказалася па сутнасці аматарскай. Для ісландцаў гуляць у футбол — не работа, а найперш адпачынак. У першым спатканні, якое праходзіла на полі саперніка, БАТЭ па сутнасці не меў асаблівых праблемаў. Хоць і прапусцілі нашы першымі — ужо на 4-й хвіліне пасля абсурднай памылкі абароны. Але пасля ўмовы дыктавалі ўжо госці — барысаўцы надзіва лёгка забілі тры галы, а маглі і яшчэ. Героем сустрэчы стаў форвард Віталь Радыёнаў, які эфектна рэалізаваў выхад самнасам і да таго вызначыўся дзвюма галявымі перадачамі-„цукеркамі". Лік 3:1 практычна адкрывае дарогу ў трэці этап адбору ў Лігу чэмпіёнаў. Канешне, там такіх слабакоў, як ісландская каманда, ужо не будзе. Апанентам барысаўцаў стане пераможца пары „Заглэмбе" (Любін, Польшча) — „Сцяуа" (Бухарэст, Румынія). У першай гульні на чужым полі 1:0 перамаглі румыны. Цяпер БАТЭ можна марыць і пра асноўны турнір Лігі чэмпіёнаў — вяршыню, якая ў суверэнны час гісторыі і блізка была недасягальнай нашым еўрадэлегатам.

У першым кваліфікацыйным раундзе Кубка УЕФА дзве нашы дынамаўскія каманды сустракаліся з латвійскімі прадстаўнікамі і ў стартавых матчах у гасцях дамагліся аднолькавага перспектыўнага выніку — 1:1. Гэта рабіла беларусаў фаварытамі перад хатнімі гульнямі. Аднак, скарыстацца пэўнай перавагай удалося толькі сталічнаму „Дынама". У спаборы з рыжскім „Сконта", камандай, якую прывыклі бачыць „цвёрдым гарэшкам", мінчане нечакана для многіх паказалі прывабны футбол і эфектна перамаглі — 2:0. Нечакана таму, што ў нацыянальным чэмпіянаце „Дынама" выступае зусім блякла і надзвычай мала забівае. На гэты раз прарвала славацкага легіянера Роберта Рака, які адзначыўся галявым дублем. Адзначым і гуляючага трэнера „Дынама" Аляксандра Хацкевіча, які не толькі кіраваў дзеяннямі падначаленых-партнёраў, але і зрабіў майстэрскі галявы пас.

А вось брэсцкае „Дынама" змушана згортваць свае сцягі. На сваім полі каманда пад кіраваннем Уладзіміра Геваркяна саступіла ліепайскаму „Металургу" — 1:2. У выніку агульную перамогу атрымалі госці, якіх трэніруе вядомы літоўскі спецыяліст Беньямінас Зелькявічус (яшчэ ў савецкія часы ён узначальваў самабытны віленскі „Жальгірыс"). Як тут не ўспомніць пра прыкрую паразу ў нацыянальным Кубку брэсцкаму „Дынама" гродзенскага „Нёмана", які відавочна сёння мацнейшы і напэўна пераадолеў бы латвійскі бар'ер. Аднак, гісторыя і час не прымаюць умоўнага ладу.

Галоўнай жа падзеяй у нацыянальным футболе на мінулым тыдні стала прызначэнне галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай. Як і чакалася, на яе чале стаў немец Бернд Штанге, мінімальна ён будзе працаваць да канца цяперашняга цыкла і ўсю наступную адборавую кампанію.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Успамінаді Лявона Луцкевіча

28 ліпеня ў Таварыстве беларускай культуры Літвы адбылося чарговае мерапрыемства, гэтым разам прысвечанае 10-м угодкам з дня смерці Лявона Луцкевіча.

Імпрэзу распачаў старшыня ТБК Хведар Нюнька, які павіншаваў прысутных з Днём незалежнасці Беларусі. „Дэкларацыя аб суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" была прынята ў 1990 годзе Вярхоўным Саветам Беларусі, якім кіраваў Станіслаў Шушкевіч. Было прапанавана, каб прафесар Станіслаў Шушкевіч стаў ганаровым сябрам ТБК.

Нельга пагадзіцца з паэтам Уладзімірам Высоцкім, які ў адным з вершаў пісаў: „Незаменимых нет!" Ёсць! Прайшло дзесяць гадоў як няма з намі Лявона Луцкевіча, а нам яго не хапае, не хапае яго парадаў, яго ўсмешкі, яго вандровак па Вільні.

З успамінамі першым выступіў Хведар Нюнька, які коратка напомніў прысутным біяграфію Лявона Луцкевіча. Нарадзіўся ён у сям'і беларускіх інтэлігентаў, вучыўся ў легендарнай Віленскай Беларускай гімназіі, за беларускую дзейнасць быў асуджаны, адбываў пакаранне на Калыме, пасля хрушчоўскай адлігі вярнуўся ў Вільню.

Лявон Луцкевіч быў адным з першых, хто пачаў адраджаць беларускае культурнае жыццё напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Ён, разам з Хведарам Нюнькам, быў адным з першых заснавальнікаў ТБК. Улічваючы тое, што бацька Лявона, Антон Луцкевіч, быў закатаваны ў засценках НКВД, дзядзька Іван Луцкевіч таксама вядомы беларускі дзеяч, ды сам Лявон адбываў пакаранне, ён на той час не мог персанальна ўзначальваць беларускую суполку. Але ён быў яе духоўным кіраўніком. 10 год сябравалі Хведар Нюнька і Лявон Луцкевіч і ні разу не разышліся ў поглядах адносна незалежнасці Беларусі, у ідэях. Хведар Нюнька нагадаў прысутным аб крыўдах, якія засталіся ў аўтара кнігі „Вандроўкі па Вільні". Ён марыў, каб кватэра беларускага мастака Пётры Сергіевіча, што па вуліцы Антокальскай 30 у Вільні, дзе на працягу дзесяцігоддзяў гуртаваліся беларусы, засталася кватэрай-музеем. На жаль, беларускае пасольства не змагло даплаціць адпаведнай сумы грошай і яе набыў бізнесмен з Грузіі. На доме ўсталявалі мемарыяльную дошку з бронзы. Пры яе адкрыцці Лявон Луцкевіч сказаў: „Хай гэта застанецца на сумленні тых, хто мог зрабіць, але не зрабіў". Другая крыўда, якой быў абураны Луцкевіч, гэта тое, што кіраўніцтва дзяржаўнай беларускай школы ў Вільні адмовіла Таварыству беларускай школы, кіраўніком якога доўгі час з'яўляўся Лявон Луцкевіч, у памяшканні. І трэцяя крыўда — тэлебачанне; на першай праграме літоўскага тэлебачання Лявон Луцкевіч распачаў тэлеперадачы „Вандроўкі па Вільні" на беларускай мове, але, на жаль, яны далейшага працягу не мелі.

Аб чым бы не гаварыў Лявон Луцкевіч, ён казаў шчыра, рабіў слушныя заўвагі. Ён з'яўляўся духоўнай глебай для ТБК, для ТБШ, для моладзі.

Выступіла таксама загадчыца беларускай кафедры Віленскага педагагічнага універсітэта д-р Лілея Плыгаўка, якая між іншым адзначыла, што каб не Лявон Луцкевіч і Хведар Нюнька, з іх уплывовым аўтарытэтам у літоўскім грамадстве, з іх мэтанакіраванасцю, арганізатарскімі здольнасцямі Хведара Нюнькі, не было б у Вільні ні беларускай школы, ні беларускай кафедры. Іх называлі беларускімі аксакаламі.

Сабраныя нагадвалі выказванні Лявона Луцкевіча, які ў свой час адзначаў, што ў складаны для гісторыі перыяд як грыбы з'яўляюцца беларускія суполкі, якія часцей працуюць не на карысць Бацькаўшчыны, а для чужых інтарэсаў. Гісторыя паказала, што ён не памыляўся.

У пачатку 1990-х гадоў Лявон Луцкевіч заклікаў падтрымаць незалежнасць Літвы. Гэтае ён аргументаваў тым, што суседняя дэмакратычная краіна будзе служыць на карысць беларусам.

Лявон Луцкевіч тады быў разам з літоўцамі, як і многія беларускія інтэлігенты Літвы. Ён застаўся ў памяці тых, хто яго ведаў, хто з ім адраджаў беларускае жыццё ў Вільні.

— Ягоная кніга „Вандроўкі па Вільні", жывы голас на радыё і ў тэлеперадачах, успаміны аб ім замацоўваюць падмурак беларускасці. Яго справа працягваецца і знаходзіцца ў надзейных руках, — сказаў Хведар Нюнька. На канец прысутныя паглядзелі відэафільм ТБК „Паховіны Лявона Луцкевіча".

У ТБК дзейнічала выстава кніг, у якіх згадваецца Лявон Луцкевіч. На ёй была прадстаўлена яго адзіная кніга „Вандроўкі па Вільні", выдадзеная ТБК, якая пабачыла свет ужо пасля смерці аўтара.

Лявон Луцкевіч памёр, калі закончыўся 2-гі З'езд беларусаў свету. У той дзень адышла ў іншы свет беларуская паэтка Наталля Арсеннева.

Імя Лявона Луцкевіча застанецца ў гісторыі Бацькаўшчыны, так як імя ягонага бацькі Антона Луцкевіча і дзядзькі Івана Луцкевіча.

Жыве Беларусь!

Леакадзія МІЛАШ

Бандароўская гасцёўня — доза адрэналіну

Ужо чарговы раз у Бандарах адбыўся беларускі фэст. Яго арганізатарам пасадзейнічалі войт Міхалоўскай гміны Марк Назарка, Гмінны асяродак культуры ў Міхалове, актыў Бандарскага салэцтва, а таксама Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства. „Бандароўская гасцёўня" — бо такая назва замацавалася ўжо за гэтым мерапрыемствам — 21 ліпеня згуртавала шматлікую публіку, якая сабралася паслухаць выступленні айчынных і замежных беларускіх калектываў. Выкананыя імі песні былі для ўдзельнікаў фэсту вяртаннем да простых і адвечных каштоўнасцей роднай культуры, да звычаяў і абрадаў дзядоў і прадзедаў. Трапна ў сваім выступленні заўважыў войт Марк Назарка, што „беларускія фэсты садзейнічаюць кантактам паміж людзьмі і культурнымі ўстановамі нашай краіны. Гэтыя кантакты самі па сабе важныя, але найбольш важнае тое, што потым народзіцца дзякуючы ім, бо ўсялякая ізаляцыя ў міжлюдскіх стасунках да нічога добрага не вядзе. У дачыненні да культуры ізаляцыя... забівае".

— Мяне, як чалавека, як старшыню ГП БГКТ, які заўсёды садзейнічае фэстам, хвалюе тое як захаваць найбольш каштоўнае, прыдбанае намі і прадзедамі, як не страціць асноўных духоўных каштоўнасцей, не згубіць любові да зямлі, культуры, да іншых людзей, — сказаў Ян Сычэўскі.

На фэсце паспяхова выступіў Народны ансамбль песні і танца „Вяселле" з Ваўкавыска. Ужо 17 гадоў радуе ён айчынных і замежных гледачоў. Песні і танцы ў іх выкананні бандарская публіка ўспрыняла вельмі цёпла. Сабраныя на плошчы перад сцэнай гойдаліся на бокі пад гукі жывых мелодый. Тут, на „Бандароўскай гасцёўні", сустрэліся землякі — беларусы, палякі ды прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. У іх вачах заўважыў я шмат радасці. Яны ў адрас калектыву „Вяселле" казалі шчырае дзякуй і прасілі перадаць прывітанне Беларусі.

Мае шматлікія суразмоўцы адзначалі, што пачутыя песні дазволілі ім дакрануцца да родных каранёў, дазволілі ім напіцца з чыстай крыніцы роднай беларускай культуры. „Бандароўская гасцёўня" для іх — гэта доза адрэналіну, асабліва для тых, хто ўмее адпачываць, слухаючы беларускія, польскія ды іншыя песні.

Вясёлкавымі колерамі пераліваліся касцюмы мастакоў, зачароўвалі адточаныя рухі спевакоў і танцораў з Ваўкавыска. „Мы, — гаварылі члены калектыву „Вяселле", — пазнаёміліся з прыгожай Беластоцкай зямлёй, мясцовым насельніцтвам, з прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі, у якіх баліць душа за родную культуру".

Незабыўнае ўражанне ў публікі пакінулі нашы фальклорныя і эстрадныя калектывы: „Рэчанька" з Козлікаў, маладзёжнае трыо з Макаўкі, „Крэс" з Міхалова ды „Каласкі", „Крыніца", „Лідэр", і „Казка" з Беластока. Іх выступленні былі духовай бяседай для ўдзельнікаў фэсту. Такія фэсты павінны ладзіцца без перашкод, бо прэзентаваная на іх культура беларускай меншасці ў Польшчы гэта ўсеагульнае багацце.

Мой чарговы субяседнік сказаў:

— Калі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі адмовіла БГКТ у датацыі, дзеячам БГКТ стала зразумела, што існуе небяспека падмены першасных, арыгінальных форм народнай культуры — беларускіх фэстаў — мерапрыемствамі іншых арганізацый. Каб прыпомніць нарастаючыя разбуральныя працэсы, мы пачалі звяртацца да беларускага насельніцтва, прыцягваць яго ўвагу да вострых праблемаў і прапанаваць канкрэтныя шляхі выхаду з гэтага складанага становішча, у якім апынуліся беларускія фэсты. У гэты складаны час нам прыходзілася працаваць саматугам і гэта было няпростае. Аднак трэба сказаць, што ва ўмовах поўнай адсутнасці ўвагі дзяржавы да аўтэнтычных беларускіх фэстаў, нашым дзеячам удалося ажывіць асяроддзе. Такім чынам раскрыліся неабыякавыя на патрэбы душы спонсары ды аказалі падтрымку. Дзякуючы гэтаму на „Бандароўскай гасцёўні" чуем беларускую гутарку і песні, бачым народныя танцы. Гэта ўсё яшчэ жыве ў нашым асяроддзі, — сказаў на заканчэнне мой субяседнік.

На маю, ніжэйпадпісанага, думку беларускія фэсты, якія набліжаюць абрады і звычаі нашых продкаў ды садзейнічаюць фарміраванню пачуццяў нацыянальнага гонару і годнасці — не пустое марнаванне часу. Гэта толькі маленькая частка тых каштоўнасцей, якія захаваліся ў нематэрыяльнай культурнай спадчыне нашых продкаў. Адмова МУСіА ў падтрымцы беларускіх фэстаў не ідзе ў карысць культурнай самастойнасці беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Наш беларус хоча жыць на сваёй зямлі спакойна, захоўваючы свае нацыянальныя карані. Папярэднія пакаленні перадалі нам свае духоўныя скарбы і наш пачэсны абавязак — не згубіць іх.

Удзельнікам фэсту свае кніжкі з аўтографамі прапанавалі Міхась Хмялеўскі і Віктар Швед. Гэты апошні прысвяціў „Бандароўскай гасцёўні" верш, які зачытаў перад сабранай публікай.

Віктар БУРА

Бандароўская гасцёўня

Жыхарам Бандароў прысвячаю

Прыехалі у Бандары
Спевакі на ўзроўні.
Просяць нас гаспадары
Да сваёй Гасцёўні.

Тут такая прыгажосць
Летняю парою!
Цешыцца тут кожны госць
У спёку над вадою.

А песню любяць тут сваю,
Таксама сваю мову,
Таму ахвотна тут пяюць
Усе госці Бандаровы.

І будуць заўжды Вам спяваць
Так ад душы, цудоўна,
Здароўя, шчасця Вам жадаць
У Вашае Гасцёўні.

Віктар ШВЕД
Бандары, 21 ліпеня 2007 г.

Роўныя і раўнейшыя

Неаднойчы задумоўваюся: чаму ў нас такая несправядлівасць? Паспрабую разважыць гэту справу на прыкладзе працаўнікоў медычнай службы. Лекары і санітаркі з акушэркамі дапамінаюцца павышэння зарплат. Кажуць, што іхнія зарплаты неадэкватныя да выконванай імі працы. Належыцца ім больш, каб магчы годна пражыць ды пракарміць сям'ю. А я пытаю ці шахцёр, чыгуначнік, навуковы працаўнік ці селянін з пенсіянерам зляплены з іншай гліны і не хочуць належна жыць? Парламентарыі сталі біць трывогу, калі патрабавалі ад іх адказацца ад часткі сваіх камандзіровачных. Настаўнікі наракаюць на нізкія заробкі. Тычыцца гэта і паліцэйскіх. У кожнага свая рацыя. Таму, па-мойму, не трэба людзей дзяліць на „роўных" і „раўнейшых". Бастуючыя атрымалі сёлета трыццаціпрацэнтную прыбаўку, але іх гэта не задавальняе. Санітаркі і акушэркі патрабуюць стаўкі тры з паловай тысячы, а лекары-спецыялісты — сем з паловай тысяч. Што затым скажуць пенсіянеры, якім адно прыбавілі некалькі злотых, ці сяляне, якія ледзь канцы з канцамі зводзяць, каб апраўдаць сваю гаспадарку? Я не супраць таго, каб павысіць зарплату лекарам-спецыялістам. Належыцца кампенсацыя за іхнюю працу, але не па такіх стаўках. У рыначнай эканоміцы лічыцца плата за працу. Так быць павінна. Але разважма іншую праўду. Лекары апрача штату ў дзяржаўнай бальніцы ці амбулаторыі займаюцца прыватнай практыкай. За кожны візіт трэба заплаціць 50-70 зл. Ад гэтай сумы не адводзяць падаходнага падатку. А карэспандэнту-пенсіянеру ад ганарараў забіраюць дзесяць працэнтаў. Ці гэта справядліва? Многія інтэрнаўты ў час пратэсту пасылалі прапановы, каб лекарам увесці касавыя апараты. Лагічна. Аднак гэтыя скандал учынілі. А пацыенты цярпяць. У чарзе да спецыяліста месяцамі трэба чакаць, а на аперацыю некалькі гадоў. Я сам гэтага зазнаў. Пытаю затым, калі гэта скончыцца?.. 15 ліпеня санітаркі з акушэркамі ліквідавалі „белы гарадок" перад Управай прем'ер-міністра. Абвясцілі затым, што пратэст часова адтэрміноўваецца. Да справы вернуцца ў верасні (пратэст працаўнікоў медычнай службы скрыўся на момант у цяні трагічных падзей — аўтобуснай аварыі ў французскіх Альпах ды ўрагану ў Чанстахоўскім павеце), але ў сераду, 25 ліпеня, я глядзеў на тэлеканале Польсат перадачу, што лекары ў найбольшым варшаўскім шпіталі па вуліцы Банаха працуюць „як на вострым дзяжурстве". Пацыентаў адпраўляюць у прыватныя кабінеты спецыялістаў. Семдзесят працэнтаў медслужбы не прыходзіць на працу. Вось, даражэнькія, да чаго дакаціліся! Гэта адно прыклад медслужбы. А што маем у дзяржаўных установах — ЗУС, КРУС ці казначэйстве? Лепш не гаварыць. Чыноўнікі ў мяккіх крэслах у шыкарна абсталяваных кабінетах працуюць, а з кліентамі як з жывёлай абыходзяцца. У сваёй логіцы карыстаюцца прынцыпам *ту* і *оні*. Дзяржаўнаму чыноўніку дазваляецца зрабіць памылку і за гэта ён не нясе адказнасці, а звычайнаму Кавальскаму прыходзіцца плаціць штраф за памылку (няўмысную, разумеецца), калі дапусціць такую ў гадавым разліку падаткаў. Не лепш маецца справа з самаўрадавымі ўстановамі.

Падагульняючы вышэйсказанае хачу прыкмеціць, што не ва ўсіх працаўніках медслужбы ці дзяржаўных чыноўніках бачу заганы. Барані Божа! Ёсць шмат добрасумленных працаўнікоў ды спагадлівых работнікаў медслужбы. Такім належыцца пашана з боку грамадскасці. І за прыбаўкай платы для такіх я падпісваюся.

Уладзімір СІДАРУК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połudn. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 000 egz.

Суседскія былі

НАКАНАВАНЫ СКАРБ

Пятрусь Шанціла ўсё жыццё марыў разбагацець. Казаў, што тое яму наканавана, як іншым прадвызначана некалі пазайздросціць ягонаму шчасцю. І не толькі марыў, як лайдак які, што ляжыць брухам угору і чакае манны нябеснай, хоць не мае ані кроплі яўрэйскай крыві, а спадзяецца на яўрэйскі цуд, маючы ў радні толькі антысемітаў. Пятрусь усё жыццё цяжка працаваў на тое, каб выйсці аднаго разу ў цэнтр мястэчка і купіць яго жыхарам усё, што тыя пажадаюць. А атрымліваў альбо ашуканства пры польскай уладзе, або палкай праз плечы пры немцах, а пры бальшавіках палачку ў ведамасці, што ён, працавіты і сумленны селянін, за год, залазячы аж па вушы ў нечыстоты калгаснай жывёлы, напрацаваў трыста шэсцьдзесят шэсць з паловай працадзён. А што рабіць з тымі працаднямі? Не з'ясі іх і нават мыла не набудзеш, каб ад тых нечыстотаў адмыцца хоць крыху. Не так ужо, што каб не смярдзець, але хаця каб у вочы людзям тое паскудства не кідалася.

Так і жыў з мазаля і кавалачка зямлі ў трыццаць пяць сотак. Ды і зямля тая з цягам часу карміць перастала. Вычарпала ўжо сябе, нібы помсцячы за здзек над ёй, якую ўчыніў гаспадар, штогод садзячы толькі адну бульбу, якую еў сам, уся сям'я ягоная і яго жывёла, уключаючы сабаку, ката ды мышэй.

Толькі дзве рэчы грэлі скамянелае ад такога жыцця сэрца старога. Першая — пяць царскіх залатнікоў, якія яму перад смерцю пакінула прыдзяцінелая бабуля і загадала, як апошняя яе воля, зберагчы і пакінуць іх ужо ягоным унукам. А другая, гэта светлая і нявінная мара разбагацець хоць калі-небудзь. Шанціла толькі ёй і жыў. Усе грошы, што з'яўляліся час ад часу, пускаў на латарэі. Аднаго разу нават выйграў рубель. Такі шчаслівы быў, мала не самлеў. Хваліўся ўсім як падлетак першай дзеўкай. Аднаго толькі на распавёў, што за білеты латарэі тры рублі аддаў. Але тое не важна. Галоўнае, што ўдалы працэс пайшоў.

Што шчасце блізка, Пятрусь цяпер быў перакананы, як упэўнены ў сваім спрыце кот, адпускаючы на тры метры паўпрыдушанае мышаня. І ці то сіла веры, ці лёс свой Шанціла прадбачыў — нарэшце ўсё сталася.

Неяк пачуў малады трактарыст Толік Кастусёў, што ў Шанцілы бульба не родзіць, а старшыня калгаса ў замене соткаў адмаўляе. Пашкадаваў старога.

— Заеду сёння да цябе на трактары і перавярну зямлю, — кажа. — Трактар глыбей бярэ, чым твой дапатопны плуг, якім яшчэ першабытныя людзі каменнага веку грэбавалі. Можа з таго толк які і будзе.

— О, дай Божа табе шчасця, унучак, — узрадаваўся стары і, як Толік засадзіў плугі ў зямлю, паплёўся ззаду за трактарам, апусціўшы гаротную галаву, нібыта ішоў за канём. Прывычка — вялікая сіла.

І тут пад лемехам нешта скрыганула і поле заблішчэла прывабнымі агеньчыкамі ззяючых на сонцы залатнікоў. Іх было так шмат, што і бульба апошнімі гадамі на тым полі не радзіла ў такой колькасці. Нават трактар заглух ад убачанага. А трактарыст толькі выгукнуў нешта нецэнзурнае, зняў шапку як па нябожчыку і на нейкі час анямеў. Толькі Пятрусь укленчыў на сырую зямлю, задзёр рукі ў неба ды плакаў, дзякуючы лёсу за такую ўдачу.

— Што рабіць будзем? — вярнулася мова да збянтэжанага Кастусёва. — Як падзелім? Па чэснаму, пароўну ці па справядлівасці?

— Пароўну, — не задумваючыся адказаў дзед. — Табе чацвёртая частка, а мне астатняе, — удакладніў ён сваё бачанне роўнасці.

— Ай, не! — не пагадзіўся Толік. — Гэта не пароўну. Пароўну — гэта дзве часткі мне, адна табе. Трактар то мой.

— Трактар калгасны, — упёрся Шанціла. — А поле маё.

— Яно тваё ўжо трыццаць год, — парыраваў Кастусёў. — Але скарбу без мяне ты не знайшоў. І капаўся б яшчэ на гэтым полі без выніку, без золата і нават без бульбы, пакуль цябе самога тут не закапалі б.

Шчаслівыя ўладальнікі скарбу яшчэ доўга і ўпарта спрачаліся, як бабы за невядома чыёй курыцай знесенае яйка. Нарэшце вырашылі: пароўну — гэта па палове. Заставалася вызначыцца, што з тымі паловамі рабіць.

— Прададзім на чорным рынку, — прапанаваў малодшы.

— Ты што! Хочаш, каб мяне на старасці гадоў у астрог упёрлі, — адмахнуўся старэйшы. — Гэта ж забаронена законам! Здадзім у дзяржаву. Я чуў, што яны за скарб грошы аддаюць. Нешта і сабе бяруць, але гэта дробязь. Тут столькі золата, што хопіць на ўсіх.

Толік доўга пераконваў старога, што нельга так рабіць. Але той упёрся як баран у плот і ніякай рады з ім. Хоць ты кол на галаве чашы. Усё як гарохам аб сцяну.

— Ну і халера з табой, — не вытрымаў трактарыст. — Едзь і здавайся. Толькі памятай — мяне не прыплятай да гэтага. Грошы дадуць — падзелім потым. Але я думаю, што мала нам кінуць. Сам некалі мяне вучыў, што савецкай уладзе верыць нельга.

Назаўтра Шанціла сабраў золата і паехаў у абласны цэнтр. Паехаў і прапаў, як кот вясной. Доўга не было. Хацелі ўжо службу за супакой душы ў царкве заказваць. А пасля з'явіўся. У суправаджэнні „кампетэнтных органаў". Яны не толькі поле перавярнулі, але і хату, а нават хлеў. І буду сабачую таксама. Пасля зніклі. І тут прыляцеў Толік.

— Ну што, стары, — кажа. — Давай дзяліць нашы грошы!

— Даруй мне, унучак, — заплакаў Пятрусь, схіліўшы галаву. — Няма грошай. Усё забралі. І яшчэ пасадзіць у турму пагражалі. Казалі, што я не ўсё аддаў. Бо які дурань, кажуць, увесь скарб здасць дзяржаве. А пасля так далі ў косці, што я нават аддаў бабуліныя залатнікі, якія яна маім унукам пакінула. Адно толькі радуе — няма ў мяне ўнукаў. Другі раз буду разумнейшым. Ніколі з уладай не звяжуся. Дарэчы, пра другі раз. Пазыч мне тры рублі на латарэю. Выйгрыш падзелім пароўну. Абяцаю.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. гаручая вадкасць з перапрацоўкі нафты для асвятлення = 9 _ 10 _ 1 _ 3 _;
2. цыркавы артыст-комік = 4 _ 5 _ 6 _ 8 _ 7 _;
3. нага жывёлы = 11 _ 12 _ 2 _ 14 _;
4. над зямлёю = 15 _ 16 _ 17 _ 18 _;
5. плесневы налёт ад сырасці або гніення = 21 _ 13 _ 20 _ 19 _ 22 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

1	2	3	4	5	6	7	8
		9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21	22

Адказ на адгаданку з 27 нумара

Перамога, старонка, Пенза, аіл, дзеўка, хваіна, забабоны, вакаліз, Алжыр, гуслі, вага.

Рашэнне: **Не паможа кадзіла, калі хвароба зваліла.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

12.08 – 18.08

Баран (22.03. — 20.04.) Скалане табою новае каханне або пазбудзешся таксічнай сувязі. Перастануць цябе турбаваць перашкоды і абмежаванні. Можаш далёка зайсці цяпер у прафесійных справах, не выказваючыся нават лішняй амбіцыяй.

Бык (21.04. — 21.05.) Справішся з кожнай перашкодай. Дасканала пойдзе табе ў фінансах, пераканаеш усіх, правядзеш усе праекты. Можаш добра зарабіць!

Блізняты (22.05. — 22.06.) Адразу распазнаеш у іншых благія намеры, дзякуючы чаму пазбегнеш клопатаў, асабліва ў новай кампаніі. Ды магчымыя праблемы на працы, з грашыма і некаторымі знаёмымі (зважай на тое, з кім гаворыш!).

Рак (23.06. — 23.07.) Можаш крыху страціць грунт пад нагамі. Можа хтосьці адсунуць цябе на абочыну або публічна падважыць тваю кампетэнтнасць. Будзеш неспакойны, прадчуваючы нядобрае (гэта не мусіць мець адлюстравання ў рэальнасці!).

Леў (24.07. — 23.08.) Будзеш вельмі спрытны, перапоўнены новымі ідэямі і выдумкамі. Сустрэнеш вельмі цікавых людзей, падобных на цябе. Ды да 15.08. не вырашай важных спраў і не разлічвай на адну асобу, якая табе штосьці абяцала.

Дзева (24.08. — 23.09.) Маеш дасканалы настрой, будзеш лагодны для іншых людзей (яны таксама ў адносінах да цябе будуць мілыя). З 16.08. можаш шмат падзейнічаць, ды зважай, каб не страціць з вачэй найважнейшага.

Шалі (24.09. — 23.10.) Зачаруеш кожнага сваёй красой, магнітнай вабнасцю. Вялікая інтуіцыя не дасць цябе нікому звесці. Спакойна адпачывай.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Маеш найбольшы нос для таго, дзе раздабыць можна вялікія грошы! 13.08 — кульмінацыйны пункт тваёй працавітасці (не мусіць гэта спадабацца блізкім). Калі занудзяць цябе інтарэсы, аддай свой час каханню; мілаванне цяпер як ніколі!

Стралец (23.11. — 22.12.) Хоць работа гарыць у руках, не забудзь аб адпачынку! Пільнуй, каб іншыя не папсавалі таго, што ты зрабіў. Не едзь у адпачынак у модныя і гучныя месцы.

Казярог (23.12. — 20.01.) 11-15.08. маеш шанц перажыць касмічнае каханне (да таго спелае і трывалае!). 13-17.08. не будзь надта даверлівым і не ацэньвай сітуацыі без роздуму (асабліва калі справа ў хуткім здабыцці багацця).

Вадалей (21.01. — 19.02.) Маладзік Месяца адкрые перад табою новы раздзел у тваёй пары (сарганізуй рамантычны вечар!). Звязаныя Вадалеі будуць узорам цнатлівасці і вернасці, затое свабодныя — прыкладам паспяховых донжуанаў.

Рыбы (20.02. — 21.03.) 11-15.08. цяжка будзе разлічваць на самога сябе. Можаш стаць ахвярай маніпулянтаў або тых, што схочуць пагуляць тваім коштам. Дарэчы, 12-16.08. сам будзеш мінацца з праўдай; папсаваць можаш з-за гэтага адносіны з калегамі.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Аляксандр Сахарчук - II

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

Расстрэл Полька - III

Баляслаў Грабінскі пражыў доўгае жыццё. Было яно дужа нялёгкім, але цікавым. Цікавым, шчырым і апантаным беларусам быў і сам Баляслаў Грабінскі — доктар-дантыст па спецыяльнасці. Але адной медыцынскай прафесіяй наш зямляк не абмяжоўваўся. Ён — адна з яркіх постацяў беларускай Вільні 30-40-х гадоў XX стагоддзя. Наш зямляк быў старшынёю партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя, старшынёй Нацыянальнага камітэта ў Заходняй Беларусі, актыўным грамадска-палітычным дзеячам на эміграцыі.

Родам з Беласточчыны

Баляслаў Грабінскі

Нарадзіўся Баляслаў Грабінскі 3 жніўня 1899 года ў вёсцы Урачыншчына Сакольскага павета. „Гаспадаром хаты, дзе я радзіўся, быў бацька маёй маткі Мацей Станкевіч. Мой бацька прыйшоў у прымічы з суседняе парафіі — з вёскі Грымячкі" (к. Сухаволі), — згадвае ў сваіх успамінах Баляслаў Грабінскі. Дарэчы, успаміны яго друкаваліся ў мінскім часопісе „ARCHE" (2000, № 5). Рукапіс гэтых успамінаў знаходзіцца цяпер у архіве БІНІМу ў Нью-Йорку. Баляслаў Грабінскі іх пачаў пісаць 3 жніўня 1979 года, калі яму ўжо было 80 гадоў.

Успаміны Баляслава Грабінскага вельмі шчырыя. Пра дзеда Мацея Станкевіча ён згадвае, што „дзед — відавочна, хацеўшы скампэнсаваць сваё невуцтва, а ня маючы свайго сына, каб паслаць у школу, — меў мяне, унука, першага па лініі да шкаленьня, бо ж толькі хлапцоў пасылалі тады ў школу. Калі ў вёсцы паказваўся хто-небудзь адзеты памястоваму, ён стараўся запрасіць на пачастунак. І ня мела розьніцы, ці то быў ксёндз, ці каморнік, ці аб'езчык, ці нават „цыцылісты" (маецца на ўвазе сацыяліст — С.Ч.) зь Беластоку, ставіў самавар, даваў на стол што меў найлепшае: копчаную ялаўцом шынку ці кілбасу, сыр, мёд, канфітуры. Апрача таго, хата Мацея Станкевіча была месцам начлегу ўсім, хто меў патрэбу пераначаваць у вёсцы... Таксама мой дзед меў звычай пазычаць грошы суседзям з ваколіцы. Пазычаў на вэксалі й ня браў працэнтаў".

Пра бацьку і маці аўтар успамінаў згадвае наступнае: „Бацька мой, Франак, быў уроджаным прыроднікам. Хаця ніколі ён не наведваў школы, але меў асаблівы талент назіральніка й чула ўспрымаў праявы натуры. Ведаў ён, як назваць кожнае зельле, кожную найдрабнейшую кветачку. Знаў ён таксама й птушыны сьвет: ведаў, як бакас, летучы з выраю, бэчаў; дзе было над Баброю гняздо чаплі; як паводзілі жураўлі на балотах; як улажыць барану на таполі для буславага гнязда, і любіў часта гаварыць пра птушак... Фізічна мой бацька належаў больш да скандынаўскага тыпу, чым да славянскага. Быў ён вышэй сярэдняга росту зь сьветлымі валасамі й блакітнымі вачыма. Маці мая была малога росту зь цямнейшымі валасамі, належала да тыпу, які антрапалёгі называюць другім сьветлым тыпам Эўропы. Зрадзіла маці ўсіх дзяцей дзесяцёра, але выгадавалася нас толькі пяць".

З вялікай павагай і дакладнасцю Баляслаў Грабінскі апісвае сваю вёску Урачыншчыну, назоў якой звязаны з тапанімікай пушчы. „У пушчы былі ўрочышчы (урочыскі), багны, пакосныя прагаліны, дубіны, грабіны, альшыны, ляшчыны й г.д. Адсюль і назовы Багнэ, Ольша, Пакосна, Ляшчане. Прыкладам, калёнія паміж лесам і маёй вёскаю звалася Ўрочыска Пакосна... Урачыншчына была малою вёскаю — 17 хатаў, каля 120 жывых душ", — згадвае аўтар.

У 80-гадовага аўтара ўспамінаў, калі яны пісаліся, захавалася добрая памяць, бо наш зямляк вельмі падрабязна ў сваіх успамінах згадвае родную вёску, кожнага яе гаспадара, які меў „запасныя сохі, выцесаныя з дубовага або бярозавага камялька", згадвае кожнае ўзвышша, вуліцу, хаты, гародчыкі, дзе вяскоўцы саджалі табаку, бо да першае сусветнае вайны не было забаронена гадаваць сваю табаку, як піша аўтар.

Адзін з раздзелаў успамінаў называецца „Мова", дзе аўтар параўноўвае гаворкі вёсак. „Каб параўнаць шкацёўскую гаворку з запушчанскаю, — піша Баляслаў Грабінскі, — даюць такі прыклад: *А ў сенцах на млінцы стаіць вада ў вядзерцы, вазьмі пітунец і нажалопкайся*. У запушчан гэты сказ будзе гучаць так: *У сенях на жорнах стаіць вада ў вядру, вазьмі кубак і напійся*".

З гумарам чытаецца ва ўспамінах згадка пра суседаў Кундзейчаў (Кундзевічаў). Вінцук Кундзейч любіў парнаграфічныя песенькі і выказы. Можа нават ён іх сам і выдумляў. Асабліва іх любілі слухаць дзеці і падросткі. Вось як гучыць адна яго мініяцюра:

Сідар, Сідар-макацёр
На дарозі бабу цёр:
Цо паверне — баба перне,
Цо пацісне — баба дрысне.

А бацька гэтага Вінцука наогул быў чалавек дзіўны. „Аднойчы, — успамінае Баляслаў Грабінскі,— ён муштраваў каня й накруціў павадок на вялікі палец левае рукі. Конь гвалтоўна шарпнуў (тузануўся) і сарваў скуру з пальца. Убачыўшы, што засталіся толькі косьці, нядоўга думаючы, ён палажыў руку на калодку й адсёк сякераю два чалонкі (фалянгі). Пасьля заўсёды прыціскаў табаку ў люльцы абрубкам вялікага пальца. Гаворачы, ён часта паўтараў *быб*, таму ў вёсцы яго празвалі Быб".

Вельмі прыгожа наш зямляк апісвае святы, якія адзначала яго вёска. Найперш, гэта Вялікдзень. Асабліва на Вялікдзень цешыліся дзеці. У гэты дзень яны разам з дарослымі маглі „зубіць яйкі, ды качаць яйкі з гары".

Другая частка ўспамінаў Баляслава Грабінскага прысвечана адукацыі. Ён успамінае тыя навучальныя ўстановы, дзе вучыўся, а таксама сяброў і людзей, якія былі з ім побач. Спачатку хадзіў дзве зімы да хатняга дырэктара. А восенню 1907 года дзед аўтара ўспамінаў завёз яго ў Дуброву ў трохкласнае прыхадское вучылішча, дзе настаўнікам быў нехта Чаквін. Але настаўнік не хацеў прымаць, бо было ўжо позна. Але дзед сказаў яму, што „я вучыўся арытмэтыкі й магу ўжо распісацца, згадзіўся прыняць в первое отделение ў першую клясу". Вось гэтак пачаўся першы трохгадовы школьны перыяд Баляслава Грабінскага ў Дуброве. Менавіта тут аднойчы ён пачуў ад маладога настаўніка Краўцэвіча (імя не памятае) наступнае: „Вы ані рускія, ані польскія, а ўсе вы беларусы". „Гэта быў першы раз, калі я пачуў назоў беларусы. Быў я тагды ў веку 9 гадоў і з кніжак ведаў Расею й пра Польшчу, але ніколі ня чуў пра Беларусь. Аднак жа застаўся мне ў памяці сказ настаўніка, і два гады пазьней я ўжо ўсьведаміўся, калі мой сваяк завёў мяне ў Горадні ў Гарадзенскі Гурток Беларускай Моладзі. Краўцэвіч быў у Дуброве толькі адзін год. Летам перад пачаткам заняткаў у наступным годзе прыехала паліцыя з Саколкі й забрала яго. Пасьля, калі я даведаўся аб існаваньні ў тым часе Беларускае Сацыялістычнае Грамады (БСГ) і Згуртаваньня Беларускіх Настаўнікаў, зразумеў, што Краўцэвіч быў сябрам гэтых арганізацыяў", — успамінае Баляслаў Грабінскі.

Цікавыя звесткі ў сваіх успамінах пакінуў аўтар пра Гарадзенскую гімназію, дзе вучыўся. Яна была „адной з найбагатшых школаў у Расейскай імпэрыі". Там тады вучыліся Язэп Лявіцкі, Янка Ляўковіч, Адам Бычкоўскі, Антон Доха, Адольф Зянюк — усе родам з Беласточчыны, усе добра вучыліся і, вядома ж, пра ўсіх трэба сёння шукаць звесткі і пісаць кнігі.

працяг ☞ II

І ☞працяг **Баляслаў Грабінскі**

Прайшоўшы першыя азы вучобы, наш зямляк паступіў і скончыў Віленскі універсітэт. Менавіта ў Вільні пачалася яго самая актыўная дзейнасць на беларускай ніве. Падчас нямецкай акупацыі, Баляслава Грабінскага абіраюць старшынёй Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні. Гэта было 20 жніўня 1942 года. Па іншых звестках, як піша Юры Туронак „на пачатку ліпеня 1941 года, дзякуючы намаганьням Уладзіслава Казлоўскага, дзеяча беларускага нацыянал-сацыялістычнага руху, нямецкія вайсковыя ўлады дазволілі аднавіць працу Беларускага нацыянальнага камітэту, зачыненага ў 1938 г. віленскім ваяводам. Паводле рапарту нямецкай службы бясьпекі, Камітэт павінен быў утварыць процівагу для „надта актыўнага літоўскага руху". Неўзабаве адбыўся ўстаноўчы сход з удзелам больш чым 60 мясцовых дзеячаў, на якім было абранае кіраўніцтва БНК. Старшынёй быў абраны Вацлаў Іваноўскі, яго намесьнікамі — Язэп Малецкі і Баляслаў Грабінскі" (Юры Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Вільня 2006, с. 231).

16 верасня 1943 года Баляслава Грабінскага арыштоўваюць літоўцы і ссылаюць у канцлагер Правянішкі. Цудам ён пазбегнуў смерці. Вось што пісаў Язэп Малецкі ў сваёй кнізе „Пад знакам Пагоні" (Таронта 1976, с. 87): „З арыштаваных палавіну лятувісы расстралялі ў ямах на Панарах, дзе яны забівалі й жыдоў. Другую ж палову вывезьлі ў лес на цяжкую працу. Там др. Грабінскі з праф. Вільчынскім спушчалі з пня тоўстыя сосны... Мы злажылі зразу ў гэбітскамісара гораду востры пратэст супроць самаволі лятувісаў. У хуткім часе др. Грабінскі й др. Грынкевіч былі звольненыя".

Пасля заканчэння Віленскага універсітэта Баляслаў Грабінскі працаваў доктарам-дантыстам, а таксама асістэнтам кафедры анатоміі медыцынскага факультэта універсітэта. Матэрыяльна быў нядрэнна забяспечаны. Таму шмат дапамагаў беларускім арганізацыям, найперш Беларускаму навуковаму таварыству, дзе быў намеснікам старшыні гэтага Таварыства. Шмат наш зямляк дапамагаў Беларускаму музею імя Івана Луцкевіча, фундаваў некаторыя беларускія выданні.

Летам 1944 года Баляслаў Грабінскі назаўсёды пакінуў Бацькаўшчыну і выехаў далёка на Захад. Ён жыў у Чыкага, а калі пайшоў на пенсію ў 1974 годзе, пераехаў у Фларыду (ЗША). За пяць гадоў сам пабудаваў сабе дом. І памёр у 92-гадовым узросце.

На эміграцыі наш зямляк шмат працаваў, прымаў самы актыўны ўдзел у беларускіх справах. Ён быў сябрам Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускага інстытута навукі і мастацтва, Беларуска-амерыканскага згуртавання. Часта друкаваўся на старонках часопіса беларускіх медыкаў на чужыне „Медычная думка", у газеце „Беларус". Апублікаваў успаміны пра Станіслава Грынкевіча, пра апошні год жыцця Францішка Аляхновіча і шэраг іншых матэрыялаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Пастушок з Вычулак

Аляксандру САХАРЧУКУ ў сакавіку паступіў дзевяносты год. Жыве ён у Чаромсе-Станцыі. Нягледзячы на пажылы век, старэча карыстаецца добрым здароўем, ды і памяць у яго дасканалая. Вось як ён успамінае мінулае.

— У 1914 годзе, як немец наступаў на Расію, дык бацька Дыянісій Сахарчук з матуляй Сафіяй падаліся ў бежанства. Пасяліліся ў Катайску. Там 26 сакавіка 1918 года я нарадзіўся. У сям'і быў старэйшы за мяне на чатыры гады брат Сяргей. З таго, што бацькі расказвалі, дык з бежанства ў Вычулкі вярнуліся мы ў дваццатым годзе. Пасяліліся ў сваёй хаце. Апрацоўвалі мы два гектары поля. У жыцці ўсяляк прыходзілася. Два ўчасткі цераспалосіцы не давалі прыбытку. Як я дасягнуў школьнага ўзросту, паслалі вучыцца. Школа ў Клюковічах змяшчалася ў драўляным будынку. Пасля яна згарэла і збудавалі мураваную. На ўроках вывучалі мы польскую мову, гісторыю, арыфметыку ды займаліся рукадзеллем і рысункамі. З настаўнікаў запамяталася мне пані Рэпка і кіраўнік Малюх. Суровы ён быў для вучняў. Як настаўніца паскардзілася, то кіраўнік выклікаў вінаватага ў кабінет і так адмысловай палкай прылажыў „лапу", што аж рука пухла. За правіннасць пакідалі ў школе пасля ўрокаў. Чатырохгадовае навучанне закончыў я паспяхова. У 1926 годзе памерла маці. Гэта было неўзабаве пасля таго, як нарадзілася сястра Галена. На наступны год пасвіў я авечак у Вычулках. За гэта бацьку плацілі збожжам. Год пазней пасвіў я кароў у Буцінскага ў Стаўбцах. Гаспадар меў шэсць штук жывёлы і вялікую палосу пашы. Затым я наймаўся пастухом у братоў Касінскіх. У кожнага было па тры каровы, якіх разам ганяў я на пашу. У Стаўбцах за пасвенне куплялі мне абутак і адзенне. Восем месяцаў працаваў я парабкам у Ласіцах. У 1936 годзе Юзэф Пятроўскі даў мне працу на малочным заводзе ў Ласіцах. Апрача мяне працавала там двух мясцовых мужчын. Рабілі мы сыры і масла. Пятроўскі прадукты пастаўляў у Варшаву. Сыроватку выкарыстоўваў у якасці корму для свінней. У Ласіцах быў другі малочны завод, які належаў да жыда. Ён не толькі ў час грошы плаціў, але і задаткі пастаўшчыкам даваў. Жыд складаў нам канкурэнцыю. У 1937 годзе Пятроўскі абанкруціўся, увольніў работнікаў і я вярнуўся ў Вычулкі.

Пасля смерці маці бацька жыў з сястрой Галенай. Старэйшы брат, Сяргей, служыў у польскай арміі. Быў ён шафёрам у 82 пяхотным палку ў Брэсце. Паколькі брат не хацеў выяўляць свайго „хахлацкага" радаслоўя, дык памяняў сваё прозвішча з Сахарчука на больш вядомае, шляхецкае Міцкевіч. Пасля нападзення немцаў на Польшчу ў 1939 годзе Сяргей стаў кадравым салдатам. Неўзабаве трапіў у палон і быў вывезены на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Да прыходу саветаў я заставаўся ў Вычулках. Напрадвесні 1941 года быў я прызваны ў савецкую армію. У Клюковічах часова размяшчаўся 700-ы пяхотны полк, у рады якога быў я залічаны. Са мною прызываліся аднагодкі з Баброўкі і Бордзеўкі. Пасля вярбоўкі абмундзіравалі нас і вывезлі на палігон у Ярэскі (Украіна). Размясцілі нас у палатках. Штодзень праходзілі мы абучэнне. Так было да пачатку вайны. 22 чэрвеня ў часці арганізавалі мітынг. Памятаю, што было гэта на захадзе сонца. Перад салдатамі выступіў генерал, які абвясціў: „Сёння раніцай гітлераўская Германія напала на Савецкі Саюз..." Паступае каманда: „Зняць лагер!". З Ярэскаў падаемся ў Палтаву, 80 кіламетраў пешшу. Загналі нас там у лазню, затым астрыглі і... на фронт. Перакінулі нас пад Смаленск. Лагер сарганізавалі нам у лесе. Удзень праходзілі мы абучэнне, а вечарам пасылалі ў разведку. Немцы ў гэты час скідалі многа дэсантнікаў. Загад камандавання быў адназначны: ліквідаваць праціўніка. Назначылі мяне да прыслугі кулямёта. У разліку было нас трох: кулямётчык і двух падносчыкаў. Мы з калегам з Грымячай (вёска за Высокім, непадалёк Волчына ў РБ — У.С.) лічыліся падносчыкамі. Кулямёт абслугоўваў малады камсамолец, навабранцам не давяралі. Аднойчы, вярнуўшыся з абучэння, пайшлі мы ў разведку. Камсамолец гаворыць: „Вы паспіце, я буду назіраць". Але і ён задрамаў. Якраз правяралі варту. Моцны штуршок падняў нас на ногі. „Изменщики родины", — сіпеў ад злосці рыжы капітан, размахваючы пісталетам. Хацеў нас прыстрэліць, але другі не дазволіў. Пазванілі ў камандаванне. Загадалі нас адставіць. Вярнуліся мы ў лагер. Камандзір папракаў: „Что было б, если немцы прорвались бы и весь полк перестреляли?" Выратавала нас тое, што пасля абучэння былі мы моцна стомлены. Камандзір паслаў нас у разведку без адпачынку. Неўзабаве з-пад Смаленска перакінулі нас на перадавую лінію. У час нямецкага наступлення рускія пацярпелі паражэнне. Трапіў я ў палон. Некалькі тысяч ваеннапалонных салдат пагналі пешшу пад Магілёў. Адтуль на аўтамабілях перавезлі нас у Мінск. Пасля пагрузілі ў вагоны і накіравалі ў Польшчу.

Апынуліся мы ў Сухажэбрах, што за Седльцамі. Загналі за агароджу, абведзеную калючым дротам. Нейкі час знаходзіліся мы пад адкрытым небам. Людзі паміралі ад голаду. У лагеры знаходзілася дзевяноста тысяч палонных. Знайшліся смельчакі, якія арганізавалі пратэстацыйны камітэт. Затым прад'явілі немцам: або пасылаеце на работу, або арганізуеце належныя чалавеку ўмовы быту. Гэта было познім вечарам з суботы на нядзелю. Немцы заявілі: „Будзем лічыць да сотні. Калі скажам дзевяноста, дык можаце ўцякаць". А думка іхняя была такая: у час пабегу ўключыць электрычны ток. Хто своечасова не праскочыць за агароджу, дык паралізаваны токам павісне на дратах. Вартаўнікоў было нямнога ды і на агароджы ўсяго былі два драты. Уцякаў я са знаёмымі хлопцамі: адзін быў з Бордзеўкі, а другі — з Баброўкі. Падаліся мы ў напрамку Седльцаў. Знясіленыя ад голаду мы ледзь-ледзь варушылі нагамі. За ноч прайшлі мы не больш чым тры кіламетры. Спыніліся мы перад вёскай, ціхачом прайшлі да стадолы і зашыліся ў сена. Ранкам гаспадар выганяў жывёлу. Хацелі мы падысці ды спытаць дзе знаходзімся, але пабаяліся. Ахвотных не было, затым пачалі гадаць. Выпала мне ісці. У памяшканні была гаспадыня. Папрасіў я хлеба. Жанчына кажа: „Што сухі хлеб жаваць, зараз малочную зацірку згатоўлю". Падсілкаваўшыся, рушылі мы ў напрамку мястэчка Морды. На адвячорку ўгледзелі сад, якога пільнаваў стораж. На вартоўню не адважыліся мы зайсці, бо знаходзілася яна побач шашы і немцы маглі ўгледзець. Непадалёк прыкмецілі мы палетак лубіну. Падаліся ў гэты бок і, разаслаўшы на зямлі палатку, прыляглі. Раніцай зайшлі мы да стоража. Вартаўнік сказаў, што дзве машыны немцаў за ўцекачамі ганяюцца і каго зловяць дык страляюць. Чарговую ноч праспалі мы ў стозе сена перад Мордамі, затым падаліся ў Нямойкі. У вёсцы былі ў мяне знаёмыя з таго часу, калі я ў Пятроўскага на малочным заводзе працаваў. У аднаго пастаўшчыка замянілі мы адзенне. Сказа-

працяг ☞III

Расстрэл Полька

У школе вучыўся я ў Круглым Ляску. Там была замужам мая сястра і школа была насупраць ейнага панадворка, блізка. А са Слабодкі ў школу, што ў Луцэ, было далёка.

У вайну немцы загадалі жыхарам Слабодкі высяліцца ў Беласток, толькі некалькі сем'яў пераехала ў Луку. Сабралі нашых вяскоўцаў у Бандарах і сталі пералічваць; мяне аднаго не далічыліся. І немец стаў шомпалам перыць майго бацьку за маю адсутнасць. Моцна пабіў бацьку і загадаў яму вярнуцца па мяне. Сям'я наша — а было нас у бацькоў дзесяцёра дзяцей — паехала фурай без бацькі, а ён прыйшоў за мною ў Круглы Лясок. Але я не хацеў у Беласток дык бацька мяне пакінуў у Круглым Ляску, а сам пайшоў за сям'ёй пехатою.

У нас было двое коней і жаробка, коней немцы пагналі ў Нараўку, а жаробку забраў я ў Круглы Лясок. І ўсіх кароў немцы забралі, мне асталося адно цялятка. І з дванаццаці авечак дзесяць забралі немцы, а дзве ўзяў я. І я там, у сястры, выгадаваў кабылку, кароўку і развёў статак авечак такі, які быў у нас да вывазу.

Пазней у збудаваннях, што асталіся ў Слабодцы, сталі хавацца партызаны і немцы загадалі раскідаць будынкі. Людзі папрыязджалі, хаты, хлявы і клуні разабралі, склаўшы дылі на падлозе або таку. Пасля вайны, калі людзі вярнуліся ў сваю вёску, дошкі ў падлозе павыкручвала ад непагоды так, што па іх цяжка было хадзіць. А калі нейкіх будынкаў не ўдалося сялянам раскідаць, дык немцы развальвалі іх мінамі, у калодзежы кідалі гранаты.

Каля самой рэчкі наша лазня асталася, у якой не толькі мыліся, але і, напрыклад, лён церлі. Я аднойчы прывёў кабылку, учапіў, і пайшоў у тую лазню заглянуць. Клямка ў ёй была адложана, хачу адкрыць дзверы, але не даю рады. Але знутры голас азываецца: „Абажджы, я цебе атамкну". Я тут жа нырнуў у крапіву, крадком да кабылкі і ў ногі. Пасля гэтага я некалькі сутак не мог заснуць!

Мне было дванаццаць гадоў, калі ўзімку ў Полька сталі заходзіць партызаны. Пабылі раз дзень, а праз нейкі час зноў 2-3 дні былі ў солтыса, Івана.

Аднойчы Юзік з Полька выбіраўся ў Беласток завезці мяса з зарэзанай каровы, каб крыху граша зарабіць. Тое мяса на фурманцы хавалі, абкладалі дровамі, быццам на апал сямейнікам, што ў Беластоку жылі. Фурманку з транспартам рыхтавалі ў Мацейкавай Гары. І я на тую фурманку вёз у саначках ад сястры крыху хлеба і мукі нашай сям'і; памагаў мне мой равеснік Матэвуш з Масева, што жыў у Івана, у Польку. Ехалі мы ад Круглага Ляска да Полька. Пад'язджаем да крыжа, а там партызаны. Мы пералякаліся, але яны нас не чапалі, адышлі. Мы з Матэвушам паехалі далей, пад'ехалі да Мацейкавай Гары і чуем выстрал вялікі.

А гэта партызаны падсолтыса, Юзіка Кужалеўскага, забілі, бо падазравалі, што ён іх выдаў. Зайшлі да яго дахаты, пасадзілі на крэсла і застрэлілі, і пакаціўся ён мёртвы. Ягоны сын, на год старэйшы за мяне, як пабачыў, што бацька нежывы, дык кінуўся з хаты ў лес і яго пасля ледзь знайшлі. Ён аж у Гарымоўскі лес уцёк. А калі вярнуўся ў вёску, дык доўгі час да свае хаты не заходзіў. Пасля заходзіў удзень, але нанач прыходзіў да мяне — так пералякаўся. Пасля, як вырас, служыў гаёвым у Марынцы.

З'ездзіў я са згаданым раней Юзікам у Беласток. Дзве ночы начавалі ў маёй сям'і. Браты мае прасілі, каб Юзік не вяртаўся дахаты, бо падазравалі што нядобра будзе. Але ж не, цягнула яго дахаты, хаця быў яшчэ кавалерам. І так вяртаемся мы праз Круглы Лясок, ён мяне высадзіў, а сам паехаў у Полька. Сонца яшчэ не зайшло, я ўспеў паесці, ён, мабыць, толькі коней выпраг.

Едуць самаходы Полька забіраць, бо ж немцы даведаліся пра партызан, што яны ў Польку нарабілі. Усіх жыхароў Полька забралі ў Міхалова ў арышт.

Прайшло пару тыдняў. Немцы зганяюць жыхароў Круглага Ляска, Мацейкавай Гары, Кузьмоў, Сахаркоў і Сакоў на пляц каля школы ў Круглым Ляску. І стаў амтскамісар чытаць тым людзям свой артыкул. Двух людзей уцякло ў „кладачку". А я ззаду стаяў, пераляканы.

Камісар загадаў: „Wszyscy do lasu!" І пайшлі ўсе, а я астаўся каля школы. І бачу — выязджаюць фурманкі, некалькі іх, вязуць жыхароў Полька. На адной фурманцы адзінаццаць чалавек павязаных, з солтысам Іванам, што трымаў у сябе партызан. І як народ увайшоў у хваіну, тады і фурманкі да хваіны даехалі; на апошняй фурманцы стаяў немец з „кружком" на плячы.

І тыя людзі з Полька ўсё везлі з сабою, у пакуначках, бо ім сказалі, што перавозяць іх у новае месца. Сказаў ім немец тыя пакуначкі выкінуць направа; і Юзік, што мяне ў Беласток вазіў, выкінуў свой чырвоны клуначак. А іх павезлі на поле і паставілі ў шэраг. Штось прачыталі, але што — я ўжо не чуў. Прачыталі і двух найбольш віноўных паставілі з бакоў, а апошніх дзевяцерых — усярэдзіне. Сказалі адвярнуцца і ўсіх адным залпам забілі. Дваіх крайніх расстралялі разрыўнымі кулямі; пасля людзі тым двум мазгі збіралі, бо галовы ім паразрывала.

Люба, жонка забітага партызанамі Юзіка Кужалеўскага, абамлела, бо цяпер немцы забілі яе бацьку Фёдара і брата Лукіяна. Людзі, што стаялі ў натоўпе, прытрымалі млеючых, бо баяліся, што і іх, як найбліжэйшых сваякоў пакараных, таксама могуць пабіць. Стаў млець і Мікалай, якому немцы забілі жончыных бацьку Лявона і братоў Данілу і Юзіка, таго, што вазіў мяне ў Беласток. Калі б быў ён паслухаў братоў маіх, жыў бы, бо немцы ўхапілі жыхароў Полька толькі раз. А стройны мужчына быў, калі б не спяшаў з Беластока дахаты, выжыў бы. І Матэвуш, мой сябра, выжыў толькі таму, што не меў трынаццаці гадоў, бо ўжо з гэтага ўзросту немцы расстрэльвалі.

Прыпёр немец да мяне і паказвае рукамі, каб яму дзве лапаты даць. Даў я яму лапаты і зараз тых пабітых на Полька павезлі. І закапалі іх там у трох ямах: у адной у садку і ў дзвюх у лесе. Пасля бабы даграбаліся з суседніх парожніх ямаў да забітых. Яшчэ Юзіка пазналі... Пасля вайны, калі нябожчыкаў з тых ямаў забіралі на могілкі, ужо нікога немагчыма было пазнаць. Я ўжо на тое не мог глядзець, уцёк.

Помнік у Польку паставілі мо ў пяцідзесяці метрах ад тых ямаў, насупраць тае хаты, у якую партызаны заходзілі.

Толькі пра мяне нічога не пішыце, што я вам расказаў, а то яшчэ зноў хто да мяне чапляцца будзе.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

II ☞працяг

Пастушок з ...

лі мы гаспадару, што вяртаемся з турмы з Варшавы. Не выявілі мы праўды, што мы ваеннапалонныя і ад немцаў скрываемся. Гаспадар пачаставаў нас малаком, а на развітанне даў мне некалькі злотых на дарогу. Дабраліся мы да вёскі Кісялева, што непадалёк Плятэрава знаходзіцца. На вуліцы прыкмецілі мы пяць аўтамабіляў немцаў. Не былі гэта жандары, толькі салдаты, якія падаваліся на фронт. Калі машыны паехалі, я рашыў зайсці ў краму. Калегі засталіся. Вярнуўшыся з крамы, я ўжо не застаў спадарожнікаў. Пакінулі мяне. У Сарнакі прабіраўся я адзінока. У Тарнопалі спыніўся я на два дні, селяніну памагаў пры сенакосах, якраз атаву збіралі. Тарнопальскія сенажаці межавалі з ракою Буг, па якой праходзіла нямецкая граніца. Мост на рэчцы знаходзіўся пад стражай. Гаспадар, якому я памагаў пры сенакосах, выявіў, што Буг можна прайсці ўброд. Праз гэтае месца кантрабандай перапраўлялі сала (за Бугам сала было таннае і яго ў Сямятычы насілі). Калі заляглі поцемкі, я падаўся ў напрамку рэчкі. У назначаным месцы зайшоў я да паловы рэчкі і тады мне страшна стала. Вярнуўся назад. Калі я выйшаў на бераг і праходзіў праз драты, якраз мяне прыкмеціў патруль. Жандары былі з сабакам. Рэзкі вокліч „Гальт!" і бліск ліхтарыка заставілі мяне спыніцца. Тут жа пародзістая аўчарка накінулася на мяне. Жандары паклікалі сабаку, затым пачалі мяне дапытваць куды іду. Адказаў я, што дадому нясу сала. Павялі мяне ў Франалова ў камендатуру. Замкнулі мяне ў кладоўцы. Апоўначы яшчэ двух такіх як я пасадзілі. Раніцай казалі нам дровы для кухні пілаваць, а калі мы закончылі работу, дык на каву папрасілі. Дзяўчына з Галоўчыцаў працавала там кухаркай і з жандарамі была ў добрых адносінах. У час размовы праявіла яна гатоўнасць пагаварыць з вартаўнікамі, каб мяне ў час змены варты перавялі праз мост. Пасля снедання сказалі зноў ісці да дроў. Кампаньёны ўцяклі пад адсутнасць жандараў і мне аднаму прыйшлося рубаць дровы. Вечарам вартаўнікі перавялі мяне праз мост на другі бок Буга.

Дамоў дабіраўся я праз Радзівілаўку ды Стоўбцы. У Літвінавічах спаткаў я Шатыловіча, які перасцерагаў перад немцамі. „Уцякай, — гаварыў прыяцель, — пяць машын жандараў за табой прыязджала. Уцекачы цябе выдалі, якіх на шашы непадалёк Сямятыч прыхапілі. У Вычулках бацьку сказалі, каб цябе ў жандармерыю даставіў". Дахаты ішоў я праз агароды. Спаткаў там солтыса. „Прыязджалі да мяне, — гаварыў, — казалі, каб цябе даставіў". Дамоў я не заходзіў ды падаўся ў Чапелі. Два месяцы назіраў я за немцамі, а калі небяспека мінавала, дык у бацькоўскі кут вярнуўся. Быў гэта 1942 год. У наступным годзе ажаніўся я з Анастасіяй — дзяўчынай са сваёй вёскі. На бацькавай гаспадарцы заставаліся мы да 1949 года, затым пераехалі ў Чаромху. На чыгуначнай станцыі я аформіўся на работу. Пабудавалі мы дом, нажылі трое дзетак — дачку і двух сыноў. У 1998 годзе памерла мая жонка. Зараз я пенсіянер і дажываю пры дачцэ Лідцы.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

1943 год: чаму Кубэ забілі, а Готберга не забілі?

У Польшчы добравядомая кніга д-ра Юрыя Туронка „Беларусь пад нямецкай акупацыяй", а гадоў дзесяць назад была яна выдадзеная па-беларуску ў Мінску, таму няма патрэбы пераказваць гісторыю гаўляйтэра Вільгельма Кубэ, шэфа нямецкай адміністрацыі ў Генеральнай Акрузе „Беларусь", якога савецкая міна з гадзіннікавым механізмам разарвала ва ўласным ложку апоўначы 22 верасня 1943 года. Падклала міну пакаёўка Алена Мазанік, а перадала ёй гэтую міну сувязная савецкай партызанкі Марыя Восіпава, пры гэтым абедзве дзяўчыны і іх родныя ў тую ж ноч былі вывезеныя ў лес, адкуль самалётам (!!) перапраўленыя на „Большую землю" ў Маскву.

Паколькі Кубэ канфліктаваў і з камандаваннем тыла групы армій „Цэнтр", і з кіраўнікамі СС і паліцыі фон дэм Бахам, фон Шэнкендорфам і іншымі, а да таго ж выступаў супраць карных пацыфікацый і прапаноўваў нейкі „пакаёвы шлях" лакалізацыі савецкай партызанкі, а беларускія калабаранты ў Мінску нават уважалі яго „прыхільнікам беларускай нацыянальнай ідэі", а змяніў яго на пасадзе генерал СС і паліцыі групенфюрэр Карл фон Готберг, то сама сабой узнікла версія, што Кубэ... „прынялі" на той свет людзі таго ж Готберга рукамі тых Мазанік і Восіпавай, тым болей, што Маскоўскае радыё ў канцы верасня 1943 года чамусьці паведаміла, што Кубэ загінуў... „от партизанской пули", альбо саветы самі не ведалі, як і што было, і таму нібыта не мелі дачынення да яго смерці, гэтаксама імёны Мазанік і Восіпавай толькі аднойчы ў 1947 годзе паявіліся ў савецкім друку, а Героя Савецкага Саюза абедзве атрымалі пасля 1956 года, і да таго ж нязменны з 1938 па 1953 год шэф НКВД БССР Лаўрэнцій Цанава ні словам (!!) не згадвае пра самую, здавалася б, бліскучую аперацыю свае агентуры ў першай энцыклапедычнай працы пра савецкую партызанку на Беларусі, якая выйшла пад яго рэдактарствам.

Гэта ўсё няясна, аднак, толькі з „цывілізаванага пункту гледжання", з пункту гледжання савецкага тут усё ясна і проста. Такія аперацыі, тым болей шчаслівы выпадак, а не заранёў дэталёва распрацаваны план, гэта проста... дзяржаўная таямніца, бо датычыцца самой тэхналогіі дыверсійнай і разведвальнай работы. А тая публікацыя 1947 года ў часопісе „Работница и Крестьянка" была... па недаглядзе рэдактара і цэнзара, за што абодвух выгналі са службы, арыштавалі і на пяць гадоў засунулі ў ГУЛАГ.

Калі раўняць справаздачу следства мінскага СД, „падазрона хуткую", і пратаколы „бесед" у Маскве з Мазанік і Восіпавай, то адно адпавядае другому цалкам ці амаль што цалкам, а на хуткасць гестапаўцаў няма чаго здзіўляцца — уся савецкая канспірацыя... ішла праз сваяцтва і знаёмства, альбо была ледзь не „празрыстай", і далей заставалася праехаць аўтамабілем з адраса на адрас і там жа, на месцы, выбіць гумай чарговага сваяка і суседа. У „беседах" Мазанік ёсць толькі два цікавыя моманты, якія сведчаць пра „ўдзел" Готберга і СС у забойстве Кубэ. Гэты „ўдзел" то поўная абыякавасць і напляваецельства на свае абавязкі афіцэраў СС з аховы Кубэ. Найхутчэй, Готберг проста адаслаў да гауляйтэра... самых тупых гультаёў, каму проста нельга даручыць нічога больш-менш важнага па службе, ды яшчэ даў ім „бацькоўскую параду", маўляў, а не лезьце вы ў тое сямейнае жыццё, бо ж Кубэ прывёз з Берліна жонку, дзяцей і поўны дом прыслугі, і не чапайце вы тых яго „рускіх" ці пакаёвак, ці каханак, якіх ён мяняе праз два-тры месяцы ці два-тры тыдні, стойце і сядзіце сабе, як балваны, адзін пры дзвярах на ганку, другі на другім паверсе за сталом з тэлефонам, у калідоры насупраць спальні...

Але нацярпелася бедная Лена Мазанік з тымі мінамі! Трое сутак (!!) хавала іх і перахоўвала ў сябе дома — то ў печку, то ў свой ложак (!!), то ў сад пад яблыняй закапае... Потым прыйшоў „дзень Х", рашылася Лена — сабрала ў торбу высціраную пасцельную бялізну, апранула паліто, бо холадна ў Мінску ў канцы верасня, узяла ў рукі сваю „дамскую сумочку"... і замест пакласці міну проста ў паліто, бо гаўляйтэр даўно і катэгарычна забараніў ахове аглядаць „сваіх пакаёвак", ці схаваць там, дзе ўсе жанчыны свету кантрабанду праносяць, то паклала міну ў тую „дамскую сумочку" і пакрыла насоўкай. Гестапавец спыніў яе ў дзвярах, абмацаў пакет з бялізнай, казаў адчыніць „дамскую сумочку", пацягнуў за насоўку так, што Лена заўважыла край міны, а гестапавец... не заўважыў, махнуў рукой і казаў „ідзі арбайтэн!" І з такога перапалоху Лена замест спакойна пакласці міну ў яе ж вядро з анучай, якой падлогу мыюць, і агледзецца ды падумаць... цяпер схавала міну пад сукенкай ніжэй станіка, „потому что сверху широкий фартух, и под ним не видно", і цэлы дзень да вечара насіла міну на сабе, пакуль не наступіла „хвіліна Х" і каляжанка-кухарка Яніна не запрасіла другога гестапаўца, які драмаў над тэлефонам насупраць спальні, піць каву. Калі гестапавец вярнуўся, Лена Мазанік якраз выпаўзала з-пад сямейнага ложка... і прыйшлося ёй гаварыць, што там закацілася яе заколка з валасоў, і замест тако, каб пратрэсці ўвесь ложак, той гестапавец толькі спытаў „колькі я буду паўтараць, што табе нідзе не можна заходзіць адной?!" і нават не дадаў ні „сцерва", ні „дура", ні „русішэ швайнэ", ну, бо Лена магла паскардзіцца Аніце, тая Аніта мужу, а муж-гаўляйтэр ізноў закаціў бы істэрыку. Весела жыў у Мінску Вільгельм Кубэ... Вось гэтых падрабязнасцей у паперах мінскага СД сапраўды няма, а ў запісах „бесед" у Маскве яны ёсць — і гэта яны выклікалі насцярогу (!!) афіцэраў ЦШПД таварыша Панамарэнкі, бо забойства Кубэ... ніхто ў Маскве не планаваў, а больш іх цікавілі менавіта „палітычныя канкурэнты" Кубэ, вышэйшыя афіцэры СС і паліцыі. Міны ж для гаўляйтэра прыйшлі ў Мінск з лесу ад палявога камандзіра пс. „Дядя Коля", бо яго сувязная Марыя Восіпава пахвалілася, што яе прыяцельніца трапіла ў пакаёўкі да гаўляйтэра — і той „Дядя Коля" па-савецку загарэўся „отличиться" лёгкай здабычай...

Тылавы паднямецкі Мінск за адно лета 1943 года ператварыўся ў перапалоханы прыфрантавы мурашнік. Чырвоная Армія гнала Вермахт ад Курска на Днепр, рушыў увесь фронт, немцы аддалі Смаленск і Бранск, войскі генерала Ракасоўскага выйшлі на Сож... і адтуль на Беларусь рушылі нямецкія тылы, шэсць (!) ахоўных дывізій СС, усе гэтыя Ostgruppen, „власовцы", казакі, калмыкі, „брыгада Камінскага", „батальён Дырлевангера", уся гэтая сволач — і за сабой цягнулі лагеры ваеннапалонных, свае сямейныя табары (!!) ... і дзесяткі тысяч прымусова выселеных „бежанцаў", каб спаленая зямля даставалася той Чырвонай Арміі. Беларусь была абвешчана „зонай антыпартызанскай вайны", фронтам... і камандуючым прызначаны быў генерал Карл фон Готберг. У верасні 1943 года немцы паважна рыхтаваліся эвакуіраваць Мінск (!!), так што той Кубэ і яго адміністрацыя маглі сабе быць, а маглі не быць, і лішні тытул „генеральнага камісара Беларусі" не даваў Готбергу нічога, па-за лішнімі клопатамі... А што Гітлер паслаў на магілу Кубэ вянок, то пасля таго, як Гімлер сказаў яму: „мой Фюрэр, каб гэтага Кубэ не забілі саветы, то ён рана ці позна скончыў бы ў мяне ў канцлагеры", і так і было...

Але ў маскоўскім штабе Панамарэнкі спецыялісты ад дыверсіі, па аналізе халяўнай „аперацыі Мазанік — Восіпавай", прыйшлі да высновы, што ў нямецкай сістэме аховы і бяспекі ёсць такая дзіра, праз якую можа зайсці любая малапісьменная баба, і не трэба для таго ні дыверсантаў, ні канспірацыйных сетак, якіх цяперашні хаос у Мінску і хапун у белы дзень (!!) соцень людзей... кожныя тры-чатыры тыдні так і так не дадуць наладзіць. У нямецкі тыл прыляцеў генерал НКВД Ваўпшасаў, абруселы літовец, член ВКП(б) з 1918 года і афіцэр ВЧК-ОГПУ-НКВД з 1920 года, майстар партызанскай і дыверсійнай вайны ў Польшчы, Кітаі, Іспаніі — і перад „работай" і чым людзей пасылаць, генерал асабіста... схадзіў у разведку пад аблічам „бежанца" ў Мінск і Вільню. І схема „ад жанчыны да жанчыны" запрацавала...

У пачатку снежня 1943 года на працягу дзесяці дзён выбухнулі міны ў афіцэрскім казіно, сталовай СД (!!), сталовай авіяштаба на Цэнтральным аэрадроме, сталовай фельджандармерыі СС, сталовыай афіцэрскай школы Waffen-SS — толькі забітымі немцы страцілі дзвесце пяцьдзесят шэсць афіцэраў СД, СС, Вермахта, Люфтвафе і ўсялякіх Ostgruppen, а яшчэ некалькі соцень параненых і кантужаных. І гэта пасля таго, як па забойстве Кубэ... павыганялі з работы ўсіх „рускіх" афіцыянтак-падавальніцаў, кухараў і кухарак, электрыкаў і гідраўлікаў, нават качагараў у кацельнях — і замянілі іх прывезенымі з Нямеччыны дзяўчатамі і хлопцамі з Гітлер'югенда. Бо дзіра ў іх была не там...

Генерал Ваўпшасаў ведаў, дзе ў іх дзіра — гэта была простая цётка Маня з вядром і анучай, каб мыць падлогі, і заставалася толькі пакласці ёй у тое памыйнае вядро з брудам 3-4 кг тратылу з ужо заведзеным партызанскай сувязной гадзіннікавым механізмам, „ты толькі занясі і пастаў, цёця Маня, там, дзе ставіш!"; каму смех, каму слёзы, але паны немцы былі так культурныя, што самі прыбіраць за сабой не жадалі, а нават баяліся белыя ручкі хоць раз у памыйнае вядро апусціць...

І генерал Ваўпшасаў ведаў „как поднять на подвиг людей" — у забіты войскам, паліцыяй і „бежанцамі" і для таго галодны Мінск кожнай такой цётцы Мані ішлі з лесу сала і яйкі, хлеб і да хлеба, і самагонка для паліцыі... і рэйхсмаркі (!!) для сябе і каб даць адступнога, дзесяткамі тысяч, і сямействы назад у лес забіралі, і толькі потым сувязная Марыйка прыносіла міну і па-добраму прасіла цётку Маню схадзіць і паставіць праклятым немцам за перагародку тое вядро паганае... А калі простай бабе выратавалі дзяцей ці пляменнікаў, то свой страх смерці яна пераступіць — бо гэта мужык або герой, або сволач, а баба без выбару. І для чаго генералу Ваўпшасаву пс. „Градов" была патрэбная тая канспірацыя, якая толькі і ўмела, што правальвацца?! Няхай шэф мінскага СД Штраўх шукае, чаго няма...

Але чаму не забілі Готберга, „дзесяць раз горшую сволач за Кубэ", і нават не спрабавалі?! Готберг не хадзіў па казіно, ездзіў на трох (!!) аўтамабілях з цёмнымі шыбамі, усё роўна як Сталін, не меў пры сабе „ніводнага рускага і фольксдойча (!!), а нават гаўно за ім выносілі... прывезеныя з турмы СС у Фатэрляндзе крымінальнікі ад крадзяжоў, але немцы. Забіць Готберга мог толькі немец- „антыфашыст", але генерал Ваўпшасаў немцам-„антыфашыстам" у нямецкім тыле не верыў ні на грош і ад такой „затеи" адмовіўся. А вось чарговы палявы камандзір пс. „Дядя Дима" сам напрасіўся, маўляў, у яго свой чалавек у нямецкім гаражы, які ў любы дзень хоць „опель-капітан" выкаціць з любымі дакументамі — і ў той Маскве знайшлі яму „немца-антыфашыста". Быў гэта штурман Люфтвафе, збіты над Масквой яшчэ ў 1941 годзе, быў да таго ж нямецкі чэмпіён па стральбе з пісталета, а брат яго быў камуніст, чаго на свеце не бывае... Штурмана перакінулі на аэрадром да „Дяди Димы", учынілі яму „проверку на дорогах", дзе штурман расстраляў нямецкі матацыкл з каляскай — і павезлі ў Мінск на аперацыю, абставіўшы дарогу засадамі на выпадак уцёкаў па рабоце.

Скончылася на тым, што гэты штурман пс. „Фелікс"... самаручна задушыў партызана-шафёра, які меў яго „в случае чего" прыстрэліць, коратка далажыўся ахове Готберга і самому генералу — і немцы расстралялі ўсе пастаўленыя партызанамі засады, пагналі брыгаду „Дяди Димы". Знішчылі аэрадром і шмат чаго наслухаліся ад „Фелікса" пра Маскву, а штурман з Люфтвафе перайшоў да Готберга ў войскі СС. Не атрымалася „так, как с Кубэ"...

Няма тут месца на тое, для чаго ў „беларускай гістарычнай свядомасці" палітычны рамантык Кубэ „кат беларускага народа", а нават школьныя настаўнікі гісторыі не ведаюць, хто такія Бах, Шэнкендорф, Готберг, Штраўх, Дырлевангер, Камінскі, у каго рукі ў крыві па локаць. Падазраю, з той простай прычыны, што Кубэ быў забіты, а Готберг шчасліва даваяваў да мая 1945 года, а потым знік і дажыў да глыбокай старасці недзе ў далёкай Аргенціне...

Алесь ЧОБАТ